РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

9 СТУДЗЕНЯ 2025 г.
ЧАЦВЕР
№ 4 (30392)

«ДУХОЎНАСЦЬ І МАРАЛЬНАСЦЬ — ПАДМУРАК МОЦНАЙ, НЕЗАЛЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на цырымоніі ўручэння прэміі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва і «Беларускі спартыўны Алімп»

Дарагія сябры!

Паважаныя лаўрэаты!

Уладыка!

Калядныя дні ствараюць асаблівую атмасферу і натхняюць на добрыя справы.

Гэтак было спрадвеку. Такім мы разумеем гэта светлае свята і сёння.

У ім вытокі нашай цырымоніі ўшаноўвання ў першыя дні новага года лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне» і спецыяльных прэмій Прэзідэнта. А само мерапрыемства ўжо стала традыцыяй суверэннай Беларусі.

І мы не ўяўляем гэтыя чароўныя дні без прыгожага ўрачыстага моманту — моманту заслужанай славы нашых дастойных людзей.

Нашы лаўрэаты — сапраўдныя падзвіжнікі і творцы сапраўднага мастацтва, захавальнікі душы беларускага народа.

Сёння мы адзначаем заслугі дзеячаў культуры, якія захоўваюць і ўзбагачаюць нацыянальную скарбніцу, абуджаюць цікавасць да народных рамёстваў, выхоўваюць павагу да нашых традыцый.

Сярод узнагароджаных таксама святары, урачы, сацыяльныя работнікі — неабыякавыя людзі, якія працягнулі руку дапамогі тым, хто сутыкнуўся з цяжкасцямі. Бескарыслівa, па поклічы сэрца клапоцяцца аб дзецях, якія трапілі ў няпростую сітуацыю ў жыцці.

Мы ганарымся поспехамі на найбуйнейшых сусветных турнірах нашых вядомых спартсменаў і трэнераў, удастоеных прэміі «Беларускі спартыўны Алімп».

СТАР. 2–3

Фота БелТА.

ЗНАЁМІМСЯ З ЛАЎРЭАТАМІ ПРЭЗІДЭНЦКІХ ПРЭМІЙ 4–5

ШКОЛЬНІКІ АСВОЙВАЮЦЬ БЕСПІЛОТНІКІ 14

Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X

АКТУАЛЬНА

ЗБЕРАГЧЫ ТОЕ, ШТО МАЕМ

Па аўтамабільных дарогах краіны перавозіцца больш за 40 % грузаў і амаль 60 % пасажыраў

На калядныя святы Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка наведаў храм Свяціцеля Мікалая Цудатворца ў Лагойску. Размаўляючы з прыхаджанамі і святарамі, кіраўнік дзяржавы акрамя іншых падняў пытанне будаўніцтва дарог. «Мною пастаўлена задача — усе раённыя цэнтры, у тым ліку Лагойск, з аграгарадкамі павінны быць звязаныя дарогамі з цвёрдым пакрыццём», — заявіў ён. Раней, у 2024 годзе, на кастрычніцкай нарадзе па пытаннях развіцця сеткі рэспубліканскіх аўтамабільных дарог Прэзідэнт падкрэсліў, што стан аўтамабільных дарог — найважнейшае пытанне для беларусаў, і засяродзіў увагу на тым, што 2025-ы — завяршальны для чарговай пяцігодкі дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі», галоўнай мэтай якой было і застаецца падтрыманне ў добрым стане асноўных аўтамабільных трас краіны.

СТАР. 6

«ДУХОЎНАСЦЬ І МАРАЛЬНАСЦЬ — НЕЗАЛЕЖНАЙ ДЗЯРЖАВЫ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Усе дасягненні лаўрэатаў і іх дзейнасць маюць высокае духоўнае і патрыятычнае гучанне.

Асабліва важна гэта зараз, калі краіна рыхтуецца адзначыць святую дату — 80-годдзе Вялікай Перамогі. Мы беражліва захоўваем памяць аб мінулым, упэўнена рухаемся наперад і смела глядзім у будучыню.

Дзякуй вам за дасягненні і перамогі.

Але важнае і іншае. Значнасць вашай працы значна большая, чым вы, магчыма, самі гэта ўсведамляеце.

Кожны ваш поспех натхняе многіх беларусаў на новыя справы, такія ж добрыя, людскія і вельмі патрэбныя.

Таму з году ў год мы сустракаемся на гэтай сцэне з людзьмі, якімі рухаюць самыя шчырыя пачуцці — вернасць свайму пакліканню і любоў да роднай зямлі.

І менавіта дзякуючы вам, шаноўныя лаўрэаты, вашаму служэнню высокім ідэалам мы паспяхова супрацьстаім тым выклікам, якія перад намі ставіць час. Час хаосу, войн, дэвальвацыі сапраўдных каштоўнасцяў.

А ісціна простая: у аснове любой чалавечай дзейнасці ляжаць духоўнасць і маральнасць (як я часта кажу, справядлівасць) — жыватворныя эліксіры для культуры, трывалай сувязі пакаленняў і традыцый.

Яны і аснова адзінства нацыі, якая ведае сваю гісторыю, шануе спадчыну продкаў і клапоціцца пра будучыню. Аснова таго, што вызначае характар народа.

Духоўнасць і маральнасць — падмурак моцнай, незалежнай дзяржавы.

Дарагія сябры!

Я віншую лаўрэатаў прэміі «За духоўнае адраджэнне», спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва і «Беларускі спартыўны Алімп».

Дзякуючы такім людзям, як вы, патрыётам, стваральнікам, наша родная Беларусь застаецца астраўком міру, спакою, чалавекалюбства і міласэрнасці.

Як бы хтосьці ні імкнуўся нас сёння расхістаць, нічога не атрымаецца.

Нічога не атрымаецца! Мы зберажом сваю краіну. Яна ўжо належыць нашым дзецям і ўнукам. Таму мы павінны падумаць аб іх будучыні, і мы думаем. Мы ўсё зробім у будучай пяцігодцы, каб наша краіна назаўжды забылася аб праблеме захавання сваёй дзяржаўнасці.

Наша краіна будзе...

(Апладысменты)

Наша краіна заўсёды будзе дзяржавай, насуперак любым плыням і тэндэнцыям на міжнароднай арэне.

Я таксама хачу павіншаваць усіх нашых беларусаў з Ражджаством. Пажадаць ім радасці. Каб вы ўсміхаліся, каб дзеці вас ніколі не засмучалі, вашы любімыя, блізкія, родныя, калегі заўсёды неслі вам радасць.

Жадаю міру, дабра, дабрабыту. Няхай вам ва ўсім спрыяе поспех, а побач будуць з вамі заўсёды родныя і блізкія.

Трэці раз вось так вось публічна пры вялікай аўдыторыі я гавару аб тым, што будучы год будзе няпростым. І я гэта кажу вам шчыра. І запомніце, хто б вам тут ні абяцаў залатыя горы, нам давядзецца напружвацца ў два разы больш, чым у папярэднім годзе. Але мы пераадолеем

ПАДМУРАК МОЦНАЙ,

усе цяжкасці. Не толькі таму, што вось я хачу банальна сказаць: «Мы адзіныя, мы натхнёныя...» Мы навучыліся працаваць! У складаных умовах. Калі нас ціснуць з усіх бакоў. Здавалася б, не, не вытрымаем. Але памятайце мае словы, я сказаў: «Забудзьцеся аб санкцыях, іх няма!» І гэта нас выратавала. Калі б толькі мы, беларусы, — эмацыйныя людзі — акунуліся ў гэтыя разважанні аб санкцыйнай палітыцы, слухайце, мы абвалілі б эканоміку, а следам і наша жыццё, і нашу дзяржаву. Таму санкцыі, не санкцыі — проста жыццё складваецца такім чынам, што ў любой сітуацыі нам давядзецца выжываць, вытрымліваць гэты націск. Мы яго вытрымаем!

Але я таксама гавару аб тым, што будучы год і, напэўна, уся пяцігодка пройдуць пад лозунгам міру і бяспекі. Будзе мір — усё астатняе прыкладзецца. Трэба зберагчы мір для Беларусі. І мы зробім гэта разам з вамі.

І апошні тэзіс, вельмі важны — новае пакаленне. Да ўлады прыходзяць, не толькі да ўлады... Мы аддаём нашу краіну ў рукі новаму пакаленню. Я чаму вам пра гэта гавару? Я казаў пра гэта ў царкве і гэтак далей для таго, каб людзі пачулі гэта.

А вам гавару таму, што нам з вамі давядзецца гэта пакаленне сфарміраваць і нам з вамі давядзецца іх пасадзіць у свае крэслы — работнікаў творчых, культуры і гэтак далей, і таму падобнае. І ва ўладу. Найцяжэйшая праца, але мы настроены яе арганізаваць і правесці.

Шчасця вам! Не хвалюйцеся. Слухайце, ну жыццё ж не толькі складаецца з таго, што будзе заўтра, паслязаўтра і іншае. Гэта важна — бачыць заўтрашні дзень. Але мы ж жывём кожны дзень, і сёння. Сёння светлыя дні, светлыя святы — Новы год, Раждаство Хрыстова. Хутка, дасць бог, Вялікдзень...

(Апладысменты)

Таму заўсёды, калі толькі можна ўсміхацца, весяліцца і радавацца, — усміхайцеся, весяліцеся і радуйцеся. Шчасця вам, дабрабыту і поспеху!

(Апладысменты)

Фота БелТА.

Даслоўна

Наталля КАРЧЭЎСКАЯ: «Усе нашы перамогі нельга аддзяліць ад нацыянальных і духоўных каштоўнасцяў»

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля Карчэўская (універсітэт быў уганараваны прэміяй «За духоўнае адраджэнне» за актыўную дзейнасць у патрыятычным выхаванні моладзі і рэалізацыю праекта «Лінія памяці. Код вайны») у адказным слове ад імя ўсіх лаўрэатаў падзякавала Прэзідэнту і ўсім, хто забяспечвае мір і згоду на беларускай зямлі. «Толькі ва ўмовах міру мы можам ствараць тое, што сапраўды трэба беларускай дзяржаве. Усе нашы перамогі нельга аддзяліць ад нацыянальных і духоўных каштоўнасцяў, гістарычнай памяці нашага народа, ад дзяржаўнай палітыкі, якую праводзіць наш Прэзідэнт», — сказала яна. Наталля Карчэўская заўважыла, што ў 2025 годзе ўсе трымаюць экзамен: экзамен перад продкамі, перад дзецьмі, экзамен на патрыятызм, на адданасць нацыянальным інтарэсам, на стойкасць дзяржаўных пазіцый. «Мы зробім усё, каб вытрымаць гэты экзамен на «выдатна», — запэўніла яна.

Алег РУМО: «У гэтай узнагародзе — вялізная праца высокакваліфікаванага калектыву»

Дырэктар Мінскага навукова-практычнага цэнтра хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі Алег Румо адзначыў, што ў цэнтра ўзнагарод нямала. Але прэмія «За духоўнае адраджэнне» (яе калектыў цэнтра атрымаў за выдатныя дасягненні ў паляпшэнні якасці медыцынскай дапамогі, развіццё навукі і папулярызацыю ідэй дабрачыннасці і міласэрнасці) — асаблівая . «У гэтай узнагародзе — вялізная праца высокакваліфікаванага калектыву, які аб'яднаны агульнай мэтай — ратаваць жыцці людзей, — адзначыў Алег Румо. — Гэты калектыў ужо амаль 50 гадоў працуе, ратуе людзей, штогод аказвае медыцынскую, стацыянарную дапамогу больш чым 30 тысячам людзей з Мінска і ўсёй Беларусі».

Алег Румо нагадаў, што калектыў цэнтра першым у краіне ў 1994 годзе выканаў аперацыі па трансплантацыі касцявога мозгу, якія былі зроблены як дарослым, так і дзецям. Мінскі навукова-практычны цэнтр хірургіі, транспланталогіі і гематалогіі першым у Беларусі выканаў аперацыю па трансплантацыі печані, а затым па трансплантацыі некалькіх органаў. «Сёння велізарны калектыў займаецца ўсімі кірункамі сучаснай высокатэхналагічнай медыцыны: пачынаючы трансплантацыяй і працягваючы кардыяхірургіяй, мікрахірургіяй, лячэннем пацыентаў з вострым парушэннем мазгавога кровазвароту. У кожным з гэтых кірункаў у апошнія гады калектыў зрабіў сапраўдны прарыў, прымяніў унікальныя распрацоўкі, якія дапамогуць істотным чынам павысіць якасць аказання дапамогі, выратаваць тысячы пацыентаў», — адзначыў Алег Румо. І, што самае важнае, па словах дырэктара цэнтра, калектыў дзеліцца сваім досведам: «Каля тысячы беларускіх урачоў за апошнія два з паловай года прайшлі перападрыхтоўку на базе адукацыйнага цэнтра, і каля 600 урачоў з розных краін прайшлі розныя стажыроўкі на базе нашага цэнтра. Мы працягваем аказваць дапамогу, выязджаючы з майстар-класамі ў розныя краіны, выконваючы найскладанейшыя аперацыі жыхарам гэтых краін».

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Протаіерэй Алег КУНЦЭВІЧ:

«МУЗЕЙ ВУЧЫЦЬ

За вялікі ўнёсак у патрыятычнае выхаванне і духоўнае асветніцтва прэмія Прэзідэнта «За духоўнае адраджэнне» сёлета прысуджана настаяцелю прыхода храма Узвіжання Крыжа Гасподняга ў Мінску протаіерэю Алегу Кунцэвічу. Высокай узнагародай адзначаны заслугі свяшчэннаслужыцеля Беларускай Праваслаўнай Царквы ў стварэнні пры прыходзе музея, прысвечанага вязням Шталага 352, і рабоце, якая праводзіцца як у самім музеі, так і ў цэлым у прыходзе. Карэспандэнты «Звязды» наведалі музей і пагутарылі з лаўрэатам пра месца, побач з якім узнік храм, і пра тое, навошта сюды неабходна прыйсці кожнаму.

АСАБЛІВАЕ МЕСЦА

— Айцец Алег, раскажыце, з чаго ўсё пачалося асабіста для вас?

— З размовы ў епархіі з мітрапалітам Філарэтам. Калі я скончыў Духоўную акадэмію, Уладыка запрасіў мяне і сказаў, што жыхары паўночнага захаду Мінска звярнуліся з просьбай пабудаваць храм каля мемарыяльнага комплексу «Масюкоўшчына», што побач з перакрыжаваннем вуліц Нарачанская і Ціміразева. Спытаў, ці буду настаяцелем. Я адказаў: «Як благаславіце». «Благаслаўляю!» Вось так і пачалося.

— Тут ніколі не было храма?

— Ніколі. Але гэта ахоўная зона, бо тэрыторыя аднаго з найбуйнейшых пахаванняў Вялікай Айчыннай вайны. Таму і дазвол на будаўніцтва тут патрабаваў асаблівага ўзгаднення на ўсіх узроўнях. Толькі на афармленне дакументаў спатрэбілася больш чым пяць гадоў. А пабудавалі, як потым падлічылі, прыкладна за столькі ж часу, колькі доўжылася Вялікая Айчынная вайна. Для будаўніцтва храма гэта тэрмін невялікі. Знайшліся людзі, якія дапамаглі ў фінансаванні, у тым ліку жыхары Масюкоўшчыны.

— Хто вашы прыхаджане?

— Розныя людзі, у тым ліку тыя, хто ведае мяне па служэнні ў іншых прыходах: у Свята-Духавым кафедральным саборы, калі толькі рукапалажыўся; у храме Опцінскіх старцаў у мікрараёне Малінаўка, дзе служыў пяць гадоў... Потым мяне перавялі бліжэй да будоўлі, бо храмавае будаўніцтва не вызваляе свяшчэннаслужыцеля ад іншых яго паслушэнстваў. Графік служэнняў застаецца той жа. І епархіяльны послух. Дадаецца афармленне дакументаў, пошук грошай... Гэта вельмі цяжка, бо трэба пабудаваць, не маючы нічога.

— У вас быў нейкі вопыт?

— У будаўніцтве вопыту не было. Але мне вельмі дапамог вопыт у чытанні чарцяжоў, які набыў падчас вучобы на машынабудаўнічым факультэце Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі. Гэта дазволіла кантраляваць і праектную працу, і будаўнічыя работы.

Апрача таго, быў багаты вопыт кіраўніка і арганізатара, таксама вельмі карысны, які ўпершыню атрымаў яшчэ ў школе. Скончыў сярэднюю школу № 2 у горадзе Оршы. Быў намеснікам сакратара камсамольскай арганізацыі, а ў дзень самакіравання — «дырэктарам» школы. Мае бацькі працавалі на Аршанскім інструментальным заводзе, адзін год пасля школы і я там працаваў. Калі паступіў у Політэхнічны інстытут, потым БДПА, мяне выбралі старастам групы. На ваеннай кафедры быў камузводам. Пасля працаваў на пасадзе начальніка аддзела продажу ў буйной камерцыйнай фірме і на іншых кіраўнічых пасадах там жа. Потым у семінарыі і духоўнай акадэміі — зноў староста групы. Усё гэта надзвычай дапамагло пасля ў зносінах з будаўнікамі.

— Калі ўзнікла ідэя стварэння музея?

— Яшчэ да пачатку будаўніцтва храма. Сам Шталаг 352 знаходзіўся па іншы бок чыгункі ў ваенным гарадку Масюкоўшчына. А сюды ваеннапалонныя звозілі трупы закатаваных. З 1964 года тут гарыць Вечны агонь. У Мінску ўсяго два такія месцы: Плошча Перамогі і мемарыяльны комплекс «Масюкоўшчына». Там Вечны агонь сімвалізуе подзвіг усяго беларускага народа, тут — канкрэтных людзей. Далёка не ў кожным горадзе ёсць Вечны агонь. Уся агароджаная тэрыторыя побач з храмам — вялізнае пахаванне. Афіцыйна ўстаноўлена, што тут ляжаць больш за 80 тысяч чалавек, але ёсць меркаванне, што можа быць да 150 тысяч. Па некаторых сведчаннях, з кастрычніка 1941-га да красавіка 1942-га ў лагеры штодня паміралі да тысячы чалавек. Ваеннапалонныя, якія трапілі туды ў ліпені — верасні 1941-га, былі ў летнім адзенні, многія — параненыя, іх амаль што не кармілі, не лячылі, яны жылі ў антысанітарных умовах, у халодных былых канюшнях з дзіравымі дахамі, у лагеры бушавалі эпідэміі. Памерлых звозілі сюды і скідвалі ў ямы, і ніхто ўжо не зможа назваць іх дакладную колькасць.

ПОДЗВІГ ВЫБАРУ

— Айцец Алег, вы сказалі, што гэтыя людзі здзейснілі подзвіг. Іх подзвіг — у пакутніцтве?

— Зусім правільна. Подзвіг — вытрымаць усе нягоды: голад, холад, хваробы, боль, нечалавечыя ўмовы, быць адрынутымі Радзімай (згодна з загадам Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання Чырвонай Арміі № 270, тыя, хто трапіў у палон, прызнаваліся дэзерцірамі, а іх сем'і падвяргаліся рэпрэсіям, пазбаўляліся ўсіх дзяржаўных дапамог і

САКРАЛЬНЫЯ ЦУДЫ БЕЛАРУСКАЙ САЛОМКІ

За значны ўнёсак у захаванне і папулярызацыю традыцыйных рамёстваў, адраджэнне народных тэхналогій саломапляцення майстар народных мастацкіх рамёстваў Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Ірына ШАВЕЛЬСКАЯ ўдастоена звання лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва.

Для Ірыны гэта гісторыя пачалася 12 гадоў таму, калі яна, у той час загадчык сельскага клуба, на курсах павышэння кваліфікацыі трапіла на майстар-клас да знакамітай майстрыхі з Іўя Юзэфы Старасцінай. Цяпер Ірына сама праводзіць майстар-класы, а яшчэ вядзе гурток па саломапляценні ў аграгарадку Гожа Гродзенскага раёна. Месяц таму ёй прысвоена званне народнага майстра Беларусі.

Ірына Шавельская стварае прадметы, якія маюць асаблівы стыль і вытанчанасць. Напрыклад, хвалістыя спадніцы на ляльках — яе ноу-хау. «У традыцыйным выкананні спадніцы на ляльках прамыя, у выглядзе конуса — з цэльнай саломкі. Асабіста я бачу іх у хвалістым адзенні. Таму і распрацавала аўтарскую тэхніку, па ёй мае творы пазнаюць. Кожны майстар імкнецца ўнесці адметныя элементы. Гэта творчасць», — паясняе сваю задуму суразмоўніца.

Вырабы майстрыхі сталі візітнай карткай Гродзенскага рэгіёна. У яе калекцыі сотні саламяных скульптур, большасць якіх толькі ў адным экзэмпляры. Выраб некаторых можа заняць некалькі тыдняў. У іх ліку — вялікі саламяны алень да Фестывалю нацыянальных культур. Нядаўна яна праводзіла майстар-клас падчас работы рэспубліканскай выстаўкі «Мая Беларусь» у сталічным міжнародным выставачным цэнтры.

Ірына Францаўна прызналася, што навіну аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта ўспрыняла з хваляваннем.

— Прыемна, што ў Беларусі створаны ўмовы для адраджэння народных традыцый, а майстры атрымліваюць такую высокую ацэнку. Думаю, менавіта такі падыход стаў падставай для таго, каб мастацтва беларускага саломапляцення ў 2022 годзе ўвайшло ў Спіс сусветнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА. Дзякуючы падтрымцы дзяржавы мы можам паказаць усяму свету наша ўнікальнае мастацтва, — выказала сваю думку лаўрэат прэзідэнцкай прэміі.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота з адкрытых крыніц.

БУДУЧАЕ І МІНУЛАЕ

Спецпрэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва ўдастоеныя два калектывы Гомельшчыны — дзіцячы сацыяльны пансіянат «Шчаслівыя ўсмешкі» і стваральнікі мемарыяльнага комплексу ў памяць аб вязнях Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне.

Работнікі пансіяната адзначаны за ўнёсак у развіццё творчага патэнцыялу дзяцей і маладых людзей з інваліднасцю, інтэграцыю інклюзіўнага мастацтва ў культурную прастору краіны. Установа працуе 14-ы год. Знешне яна нагадвае ўтульны катэджны гарадок: пяць жылых карпусоў і асобны, адкрыты два гады таму, тэрапеўтычны рэабілітацыйны корпус. Абслугоўваюцца тут 140 чалавек: 65 — у групе дзённага знаходжання і 75 — дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, і маладыя людзі з інваліднасцю — кругласутачна. Адна з галоўных мэт работы калектыву «Шчаслівыя ўсмешкі» — нармалізацыя жыцця сем'яў, у якіх выхоўваюцца дзеці з інваліднасцю, асабліва з цяжкімі шматлікімі парушэннямі ў развіцці. Ва ўстанове аказваюць усе неабходныя сацыяльныя паслугі па псіхолага-педагагічнай карэкцыі, медыцынскай і сацыяльна-бытавой рэабілітацыі, прафарыентацыі і працоўнай тэрапіі.

Высокай узнагародай адзначана таксама праца аўтарскага калектыву стваральнікаў мемарыяльнага комплексу ў памяць аб вязнях Азарыцкага лагера смерці ў Калінкавіцкім раёне ў складзе начальніка бюро галоўных інжынераў праекта ААТ па комплексным праектаванні аб'ектаў жыллёва-грамадзянскага прызначэння «Інстытут Гомельграмадзянпраект» Вольгі Ачапоўскай, загадчыка навукова-асветнага аддзела Гомельскага абласнога музея ваеннай славы Вікторыі Заяц і загадчыка філіяла «Мемарыяльны комплекс вязням Азарыцкага лагера смерці» Калінкавіцкага краязнаўчага музея Зінаіды Хлебавец.

Маштабная рэканструкцыя мемарыяла ў Азарычах стала знакавым праектам для ўсёй краіны. Магчымасць далучыцца атрымаў кожны беларус — на рэканструкцыю комплексу былі накіраваны сродкі, зароблены на рэспубліканскім суботніку. Адметнасць мемарыяльнага комплексу — першы ў краіне памятны знак у гонар подзвігу савецкіх ваенных медыкаў, якім удалося спыніць эпідэмію тыфу пасля вызвалення палонных Азарыцкага лагера смерці.

Наталля КАПРЫЛЕНКА,
фота аўтара.

АДРОЗНІВАЦЬ ХЛУСНЮ АД ПРАЎДЫ»

падтрымкі) і пры гэтым не пайсці на службу вермахту. Ім літаральна штодня зачытвалі 270-ы загад, з якога вынікала, што яны ў сваёй дзяржаве нікому не патрэбныя, і прапаноўвалі супрацоўніцтва з «новай уладай», а гэта азначала, што іх адразу накормяць, адзенуць і вылечаць. Потым дадуць дубінку і паставяць ахоўваць іншых ваеннапалонных альбо накіруюць у іншае месца — у нацысцкай Германіі была цэлая праграма на гэты конт. І вось, ведаючы гэта, людзі цярпелі нягоды палону да самага свайго канца.

Скажу больш. Калі мы будавалі храмавы комплекс і здараліся цяжкія фінансавыя сітуацыі (узнікала запазычанасць перад будаўнічымі арганізацыямі) і я не ведаў, дзе браць грошы, тады прыходзіў на месца пахавання, абыходзіў яго з малітвай да Бога, прасіў аб хадайніцтве пакутнікаў, якія ляжаць там, і праз чатыры-пяць дзён знаходзіўся чалавек, які прапаноўваў дапамогу. Кожны раз такія цуды здараліся, і кожны раз Гасподзь паказваў мне маё малавер'е праз заступніцтва гэтых пакутнікаў.

Падчас малебну на пачатак будаўніцтва, як толькі прагучала першае: «Благаславён Бог наш...», хмары над участкам расступіліся, неба ачысцілася, і сонца асвяціла гэта месца, а над усім Мінскам ішоў мокры снег. Як толькі завяршылі малебен, хмары зноў сышліся. І ўсе, хто гэта бачыў, перажылі натхненне і радасць ад таго, што Гасподзь апякае гэтае месца. І тады сумненняў, што храм будзе тут пабудаваны, не засталося.

ПАРЫЎ ДУШЫ

— Вы сказалі, што ідэя аб стварэнні музея была з самага пачатку. Як яна ажыццяўлялася?

— Спачатку мы не ведалі, дзе размесціцца музей і якім ён будзе. Першым пабудавалі прычтавы дом, потым храм. І калі завяршалі прычтавы дом, то ўжо ведалі, што музей будзе ў ім. Вобраз музея фарміраваўся калегіяльна. І гэта не быў вынік разумовага працэсу, гэта быў вынік парыву душы, аднадумнасці: што тут павінна быць. Так нарадзіўся той вобраз, які і быў ажыццёўлены.

— Якую ролю музей выконвае ў прыхадскім жыцці?

— У першую чаргу ён выхоўвае моладзь. Да нас прыходзяць школьнікі, студэнты, навучэнцы з самых розных устаноў адукацыі. Мы не толькі праводзім экскурсіі, але і гутарым з маладымі людзьмі. Як толькі музей адкрылі, мы кожную нядзелю пасля літургіі збіралі ўсіх, хто жадаў, і прыводзілі ў музейную залу. Для груп візіцёраў яна адкрыта тады, калі ім зручна. Тое ж самае — для людзей, якія шукаюць звесткі пра сваякоў. Яшчэ тры-чатыры гады таму да нас прыходзілі ветэраны, прыводзілі дзяцей, унукаў і праўнукаў, дзякавалі са слязамі на вачах, казалі: «Добрую справу вы робіце». Апошнія пару гадоў прыходзяць ужо толькі іх дзеці, унукі і праўнукі.

— Адносіны да ваеннапалонных мяняліся няхутка. Нават дзіўна, што ўжо праз 20 гадоў тут узнік мемарыял, бо так адбылося далёка не ўсюды. Ці заспелі вы адгалоскі прадузятых адносін да ўвекавечвання памяці вязняў Шталагу падчас будаўніцтва храмавага комплексу?

— Шчырага непаразумення не было. Магчыма, усведамленню маштабаў трагедыі, якая тут адбылася, дапамог фільм, які мы зрабілі. Я дарыў яго на дыску ўсім, ад чыіх рашэнняў залежала справа будаўніцтва. Мы дэманструем яго наведвальнікам музея.

Акрамя таго, мяне пазнаёмілі з пісьменнікам Мікалаем Гаўрылавым, які сказаў, што хоча напісаць аповесць пра вязняў Шталагу 352. Мы падышлі з ім да абраза Маці Божай Мінскай і папрасілі благаславення ў Прасвятой Багародзіцы. Праз паўгода з'явілася кніга «...І ўтрэ Бог кожную слязу», заснаваная на рэальных падзеях. Мікалай працаваў у архівах, аднавіў храналогію бамбёжак Мінска, гутарыў з тымі, каму ў першыя месяцы ўдалося збегчы з лагера. Кніга атрымала ўзнагароды некалькіх міжнародных конкурсаў. Яна напісаная такой мовай, што адарвацца ад яе немагчыма. І той, хто прачытвае яе, ужо не пытаецца, у чым подзвіг ваеннапалонных.

РАЗУМЕННЕ, ЯК ПРАВІЛЬНА

— Наколькі вялікая была каманда, якая ажыццяўляла задуманае?

— Спярша гэта былі два чалавекі — я і юрыст Валерый Шобік. Паступова наша каманда разрасталася. Калі завяршалі будаўніцтва, то імёны тых, хто дапамагаў (не толькі фінансава), нанеслі на званы. Больш за 200 імён. Званы ў нас унікальныя — з беларускім арнаментам, беларускімі цудатворнымі абразамі Прасвятой Багародзіцы і выявамі беларускіх святых. Кожны звон — выраб мастацтва.

— Калісьці вы ўзяліся за будаўніцтва храма і далі музей, цяпер, акрамя звычайнага прыхадскога жыцця, прымаеце гасцей, дэлегацыі, групы турыстаў і праводзіце экскурсіі і гутаркі з моладдзю — усё гэта дадатковыя нагрузка і клопат. Ці не прасцей было б без музея?

— Кожны свяшчэннік увесь час сутыкаецца з чалавечым горам і прапускае яго праз сябе. І сілы яго — духоўныя і іншыя — заканчваюцца. Але калі свяшчэннік рукапалагаецца, архірэй прамаўляе словы пра тое, што Гасподзь заўсёды гэтыя сілы аднаўляе. Таму, калі сілы заканчваюцца, яны зноў прыходзяць — ад Бога. Праз набажэнства, якое здзяйсняеш, і ў маім выпадку — праз духоўную падтрымку пакутнікаў, каля пахавання якіх стаіць наш храм.

Ці не прасцей было б без музея? Бадай, не. Ёсць разуменне, як правільна, і калі гэтага не зрабіць, душы спакойна не будзе. А потым знаходзяцца аднадумцы, і іх нямала. І тады ўжо важна не перашкаджаць рабіць тое, на што ўтлумачвае Гасподзь. Тады ўзнікае адчуванне пчалінага вулля, калі кожная пчала ведае сваю справу.

— З моманту рэалізацыі ідэі, за якую вы некалі ўзяліся, прайшло амаль чатыры з паловай гады. Як змянілася роля музея за гэты час?

— Аб'ём яго наведвання ўвесь час расце. Людзі, якія апынуліся ў ім аднойчы, прыводзяць сваіх блізкіх. За адным класам прыходзіць уся школа. Тое самае — ВНУ. Да нас едуць з іншых гарадоў.

— Галоўны пасыл, які закладзены ў канцэпцыю музея: застацца чалавекам у нечалавечых умовах?

— Думаю, кожны выносіць адтуль сваё. Нехта — тое, пра што вы сказалі. Нехта ўбачыць бессэнсоўнасць вайны, яе трагізм, перажыўшы вязні Шталагу. Нехта ўбачыць, што стаіць за словамі тых, хто навязвае свае правілы і каштоўнасці. Рэальнасць, якую прынеслі на нашы землі быццам бы цывілізаваныя немцы 84 гады таму, мы бачым на прыкладзе такіх лагераў, як Шталаг 352. Музей вучыць адрозніваць хлусню ад праўды. Ён расказвае, што такое фашызм. Ён вучыць любіць Радзіму.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

НАША СПАДЧЫНА

Спецпрэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва ўдастоена загадчык аддзела традыцыйнай культуры Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Таццяна ЛАПКОВА за асабісты ўклад у захаванне і папулярызацыю тэхналогіі апляцення бяростай ганчарнага посуду.

«Спакон веку нашы продкі выкарыстоўвалі бяросту для рамонту разбітага або трэснутага керамічнага посуду. Карой закрывалі месца пашкоджання і замацоўвалі вяроўкай. Пасля гэтага посуд можна было выкарыстоўваць», — расказвае Таццяна Лапкова.

Аплецены посуд знаходзілі падчас археалагічных раскопак. Маюцца таксама пісьмовыя крыніцы аб прымяненні такой тэхналогіі на беларускіх землях. Вядомы этнограф Мікалай Нікіфароўскі апісваў традыцыі, якія існавалі на Віцебшчыне. Паводле яго інфармацыі, аплётку рабілі не толькі для рамонту, але і дзеля даўгавечнасці.

У фондах Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту знаходзяцца керамічныя вырабы з берасцянай аплёткай з Шаркаўшчынскага, Мёрскага, Лепельскага, Расонскага і Шумілінскага раёнаў. «Аплецены гліняны посуд мае каларытны знешні выгляд і несумненўныя дэкаратыўныя ўласцівасці. Для Віцебшчыны характэрныя ёмістыя, масіўныя, слабапрафіляваныя формы, якія адрозніваюцца архаічнай строгасцю, што згладжваецца і ажыўляецца касым або спіралепадобным узорам залацістых бярозавых стужак, якія пакрываюць выраб», — адзначае лаўрэат.

Абласны метадычны цэнтр народнай творчасці праводзіць работу па папулярызацыі і распаўсюджванні гэтага віду творчасці, арганізуе розныя конкурсы, фестывалі. У ліку найбольш папулярных — Міжнародны пленэр дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і конкурс ганчарнага мастацтва «Гліна спявае», які праходзіць у Копысі Аршанскага раёна.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА. Фота з архіва гераіні.

ПА ДАРОГАХ ПАМЯЦІ І СЛАВЫ

Сярод ушанаваных спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва — Магілёўская абласная арганізацыя БРСМ, тэлерадыёкампанія «Магілёў» і Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава. Яны разам рэалізавалі міжнародны маладзёжны патрыятычны праект «Дарогамі Памяці і Славы».

Ініцыятыва нарадзілася ў маладзёжным асяроддзі пры падтрымцы непасрэдна старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Ісачанкі. Пачынаўся праект у 2022 годзе як абласны і ўжо на наступны год аб'яднаў моладзь не толькі Магілёўшчыны, але і расійскіх абласцей — Смаленскай, Бранскай, Ленінградскай, Астраханскай і Хабараўскага краю. Летась да яго далучыліся маладыя актывісты яшчэ і Тульскай, Калінінградскай, Маскоўскай абласцей і Мардовіі.

На працягу апошніх трох гадоў у дні, калі Беларусь і Расія святкуюць Перамогу над нямецка-фашысцкай Германіяй, стылізаваная калона з перасоўнымі музеямі, тэхнікай часоў Вялікай Айчыннай вайны, палявой кухняй адпраўляецца па шляху герояў-вызваліцеляў. Спачатку гэта былі раёны Магілёўскай вобласці, потым яшчэ Бранскай і Смаленскай. У кожным пункце маршруту ўдзельнікі аўтапрабегу сустракаюцца з мясцовым насельніцтвам, ладзяць адкрытыя дыялогі, флэшмобы, экскурсіі, канцэрты, закладваюць паркі.

Шмат водгукаў атрымалі перасоўныя музейныя экспазіцыі. У адной з іх свае знаходкі дэманстраваў Магілёўскі абласны гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру», ладзілі выстаўку актывісты БРСМ. Для другой тройчы рыхтаваў экспазіцыю Магілёўскі абласны краязнаўчы музей імя Е. Р. Раманава.

— Першы год яна была прысвечана дасягненням Магілёўшчыны, — расказвае **намеснік дырэктара музея Аляксандра БУРАКОВА.** — Потым экспазіцыі па Вялікай Айчыннай вайне ствараліся разам з Бранскім дзяржаўным краязнаўчым музеем. У склад леташняй увайшлі экспанаты нашай унікальнай выстаўкі «80 рэліквій Вялікай Айчыннай вайны». Сярод іх — гімнасцёрка з Асіповіцкага раённага гісторыка-краязнаўчага музея, якая не так даўно была знойдзена на гарышчы старога дома. Быхаўскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей падзяліўся незвычайнай каскай, якая была знойдзена падчас пошукавых работ. У ёй знаходзіўся невялічкі абразок свяціцеля Мікалая Цудатворца...

Сёлета Магілёў збіраецца ажыццявіць яшчэ адзін глабальны праект — адкрыць маштабны музей Славы Магілёўшчыны на Буйніцкім поле. Гэта будзе трэці філіял абласнога краязнаўчага музея. Два іншыя — абласны мастацкі музей імя П. Масленікава і Бялыніцкі раённы мастацкі музей імя В. К. Бялыніцкага-Бірулі — з'явіліся ў апошнія дні снежня.

— Музей у Буйнічах будзе ўнікальны, — кажа Аляксандра Буракова. — Расіяне на ўзроўні Саюзнай дзяржавы прымаюць удзел у яго будаўніцтве. Тэматыка ў асноўным прысвечана Вялікай Айчыннай вайне, але ў кантэксце гістарычнага шляху, пачынаючы ад трыццатых гадоў і заканчваючы сучаснымі.

Аляксандра Буракова адзначае, што музейная справа развіваецца дзякуючы падтрымцы дзяржавы. Напрыклад, у рамках праграмы «Культура Беларусі» былі абноўлены экспазіцыі шэрагу раённых музеяў.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Фота з архіва Аляксандры БУРАКОВАЙ.

ЗБЕРАГЧЫ ТОЕ, ШТО МАЕМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аб тым, наколькі паспяхова гэта ўдаецца дарожным арганізацыям Беларусі і аб планах па развіцці дарожнай сеткі — размова з **начальнікам упраўлення развіцця аўтамабільных дарог Галоўнага ўпраўлення аўтамабільных дарог Міністэрства транспарту і камунікацый Леанідам ЗЯНКЕВІЧАМ.**

— Леанід Славаміравіч, як вы ацэньваеце сённяшні стан транспартных артэрый краіны?

— За апошнія дзесяцігоддзі нагрузка на беларускія дарогі істотна ўзрасла. І ў гэтым няма нічога дзіўнага: у дзясяткі, а то і больш разоў вырас транспартны паток, грузавыя аўтамабілі прыкметна паціжэлі. Менавіта праезд грузавых аўтамабіляў аказвае найбольшае ўздзеянне на дарожнае пакрыццё. Звышнарматыўныя восевыя нагрузкі, натуральна, прыводзяць да заўчаснага разбурэння канструкцый дарожнага адзення. Каб прывесці дарогі да нарматыўных патрабаванняў, неабходны немалыя ўкладанні, што, у сваю чаргу, прыводзіць да росту фінансавых выдаткаў дарожных арганізацый. Таму прынята рашэнне ў наступнай пяцігодцы асаблівую ўвагу аддаваць рамонту дарог на найбольш запатрабаваных участках з давядзеннем дапушчальнай нагрузкі на вось да 11,5 тоны.

— Якая працягласць і шчыльнасць сеткі аўтадарог у нашай краіне?

— Сетка аўтамабільных дарог агульнага карыстання Рэспублікі Беларусь ужо сфарміравана і складае 86,5 тысячы кіламетраў. З іх рэспубліканскіх дарог — 15,3 тысячы кіламетраў, мясцовых — 70,6 тысячы. Калі ісці далей па статыстыцы, цвёрдае пакрыццё маюць 76,6 тысячы кіламетраў дарог — гэта 89 %, у тым ліку ўдасканаленае пакрыццё, то-бок асфальтабетоннае, цэментабетоннае, чорнае жвіровае і чорнае шчэбеневае складае 49,6 тысячы кіламетра, ці 57 %.

За 27 гадоў працягласць сеткі дарог агульнага карыстання, а мы бяром перыяд з 1997-га — года прыняцця першай дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі», узрасла ў 1,6 раза і стала даўжэйшай на 33,2 тысячы кіламетраў. Гэта вялікая лічба. Мясцовая сетка не нашмат адстала і павялічылася на 32,7 тысячы кіламетраў.

На сёння на дарогах агульнага карыстання — 5220 мастоў і пуцеправодаў агульнай працягласцю 186 кіламетраў. З іх на рэспубліканскіх дарогах — 2248 аб'ектаў маставой будоўлі працягласцю 107 кіламетраў, на мясцовых — 2972 працягласцю 79 кіламетраў. Жыхары краіны ўжо прывыклі да добрай традыцыі, калі кожны год да лістападаўскіх свят у Беларусі адкрываецца рух па новым альбо капітальна адрамантаваным дарожным аб'екце — месце, пуцеправодзе, дарозе. У 2024 годзе ва ўрачыстай абстаноўцы быў адкрыты рух па рэканструяваным участку аўтамабільнай дарогі М-3 ад Лагойска да Плешчаніц, а таксама па ўчастку дарогі Р-46 ад Сарочына да Полацка. Дарэчы, на гэтым участку была павялічана і нагрузка на вось.

— Наступіўшы год завяршае чарговую пяцігодку дзяржпраграмы «Дарогі Беларусі». Якіх вынікаў дасягнулі? Як за гэты час змяніліся і самі дарогі, і тэхналогіі іх будаўніцтва і рамонту?

> **Пры нашым клімаце (вы бачыце: учора — мароз, сёння — адліга) у нас праблем з дарогамі хапае. Таму патрэбныя велізарныя сродкі для таго, каб хоць бы падтрымліваць дарогі ў нармальным стане. Тым не менш мною пастаўлена задача: усе раённыя цэнтры, напрыклад Лагойск, з аграгарадкамі павінны быць звязаны дарогамі з цвёрдым пакрыццём. Мы павінны, як бы ні было складана ў краіне, на працягу наступнага года пераадолець гэта».**
>
> **Аляксандр ЛУКАШЭНКА на святе Раства Хрыстова ў храме Святіцеля Мікалая Цудатворца ў Лагойску, 7 студзеня 2025 г.**

— Калі коратка, то ў цэлым мы выканалі паказчыкі праграмы. Калі шырэй, то ў 2023 годзе аўтамабільных дарог рэспубліканскага і мясцовага значэння адрамантавана ў паўтара раза больш, чым у папярэднім — болей як 3 тысячы кіламетраў. У 2024-м адрамантавана больш за пяць тысяч кіламетраў дарог рэспубліканскага і мясцовага значэнняў. Таксама ў мінулым годзе мостабудаўнікі аднавілі 119 маставых збудаванняў, у 2023 годзе іх было 107.

На 2025-ы год у дарожнікаў планы не менш амбіцыйныя, набраны тэмп па аб'ёмах рамонту і мадэрнізацыі дарожнай інфраструктуры плануем захаваць.

— Ці можна ўжо сёння назваць прыярытэтныя задачы на наступную пяцігадовую праграму?

— Адзначу яшчэ раз, што сетка аўтамабільных дарог краіны ўжо сфарміравана і новая праграма, як і дзеючая, у першую чаргу будзе накіравана на захаванне таго, што маем. Асобна, як і даручаў Прэзідэнт, будуць вызначаны дарогі з цэментабетонным пакрыццём. Асаблівая ўвага таксама будзе аддадзена пераводу дарог са жвіровым пакрыццём ад аграгарадкоў да райцэнтраў у дарогі з удасканаленым пакрыццём. У дзяржаўную праграму будуць уключаны рэканструкцыя і ўзвядзенне аўтамабільных дарог, якія з'яўляюцца ўчасткамі транспартных калідораў «Захад — Усход» і «Поўнач — Поўдзень» і іх працягаў.

Яшчэ адна з важных задач звязана з участкамі дарог з недастатковай апорнай здольнасцю 6—10 тон на вось, што праходзяць у раёнах размяшчэння буйных вытворчых прадпрыемстваў, якія перавозяць сваю прадукцыю цяжкавагавымі транспартнымі сродкамі. У найбліжэйшай перспектыве плануем павялічыць аб'ёмы рамонтных работ, каб не толькі захаваць, але і палепшыць такія дарогі. А пры правядзенні капітальных рамонтаў павялічваць на іх максімальную нагрузку на вось да 11,5 тоны. Таксама перагледзім сітуацыю з маставымі збудаваннямі, якія не адпавядаюць нарматыўным патрабаванням па грузападымальнасці.

Сёння найбольшая інтэнсіўнасць руху, у тым ліку цяжкавагавага аўтатранспарту, назіраецца паблізу Мінска. Каб забяспечыць сталіцы экалагічную бяспеку, а дарогам — устойлівасць да высокіх нагрузак, даўгавечнасць і адсутнасць каляіны, у найбліжэйшыя гады плануецца перавесці асноўныя выхады з Мінска, у межах другой КАД, у аўтамабільныя дарогі з цэментабетонным пакрыццём.

— Вопыт выкарыстання цэментабетоннага дарожнага пакрыцця быў ужыты пры будаўніцтве другой мінскай кальцавой аўтадарогі. Наколькі ён стаў паспяховым і дзе яшчэ знайшоў ці знойдзе прымяненне?

— Перад пачаткам рэканструкцыі любой аўтадарогі вызначаецца эканамічная мэтазгоднасць таго ці іншага тыпу пакрыцця. Практыка паказала, што ў любых кліматычных умовах і пры любой інтэнсіўнасці руху цэментабетоннае пакрыццё з'яўляецца больш даўгавечным, чым асфальтабетоннае. Найбольш эфектыўнае прымяненне гэтага матэрыялу — пры ўзвядзенні новых дарог і рэканструкцыі існуючых, напрыклад, пры пашырэнні іх да чатырох і болей палос пры магчымасці скіду руху транзітнага транспарту на суседнія палосы.

А вось укладваць такое пакрыццё на ўжо існуючых двухпалосных аўтадарогах, калі адсутнічае магчымасць скіду руху, немэтазгодна. Растлумачу: час набору трываласці ўладкаванага цэментабетоннага пакрыцця даволі доўгі — амаль цэлы месяц. На такіх дарогах узнікае неабходнасць пабудовы часовых аб'ездаў. Гэта дорага, таму ў такіх выпадках пераважа аддаецца асфальтабетону.

Што датычыцца далейшага выкарыстання цэментабетону, то ў наступнай пяцігодцы, з 2026 да 2030 года, плануецца рэканструяваць каля 250 кіламетраў рэспубліканскіх дарог і 200 з іх будуць з цэментабетонным пакрыццём.

Алена ВІНАГРАДАВА.
Фота з адкрытых крыніц.

Задача ад Першага

> ***Вы павінны быць правадніком айчынных тавараў у рэгіёны, асабліва ў глыбінку. Ад гэтага выйграюць усе. Але ўважліва ацаніце перспектывы. Калі гэта апраўдана, пастаўце на маршрут аўтакраму з нармальным графікам работы. Вяскоўцы павінны атрымаць якасную замену стацыянарнай краме.***
>
> *Аляксандр Лукашэнка на агульным сходзе прадстаўнікоў членаў Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў.*
> 16 лютага 2024 года.

У Магілёве ўручылі ключы ад новых аўтакрам

30 сучасных гандлёвых аўтамабіляў «МАЗ-Купава» паступіла напярэдадні Новага года на ўзбраенне Магілёўскага аблспажыўсаюза. **Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА** і **старшыня праўлення Белкаапсаюза Інэса КАРАТКЕВІЧ** ва ўрачыстай абстаноўцы ўручылі сертыфікаты і ключы ад машын кіраўнікам раённых арганізацый гэтага ведамства. Аўтамабілі набытыя ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 309 «Аб падтрымцы арганізацый спажывецкай кааперацыі».

Па краіне 513 аўтакрам абслугоўваюць 13 800 населеных пунктаў, у тым ліку 5800, дзе жыве да 10 чалавек. Старшыня праўлення Белкаапсаюза ў сваім выступленні адзначыла, што ведамства даедзе да кожнага чалавека і выканае любы спажывецкі попыт. Яна падкрэсліла, што на «кааператарах» ляжыць вялікая адказнасць за аказаную падтрымку.

— Усе нарматыўныя акты, якія прымаюцца ў нашай краіне, усе мэты і задачы, якія ставіць перад намі кіраўнік дзяржавы, накіраваны ў першую чаргу на паляпшэнне якасці жыцця нашага насельніцтва, — адзначыла яна. — На пачатку года Прэзідэнт выразна абазначыў патрабаванні да якасці абслугоўвання сельскага насельніцтва. Разумеючы, што ёсць шмат населеных пунктаў, дзе жыве мала людзей і развіцця бізнесу там няма, дзяржава аказвае каласальную падтрымку. Адпаведны ўказ дае шмат прэферэнцый і мер для падтрымкі арганізацый Белкаапсаюза. У тым ліку і набыццё новых двухсот сарака аўтакрам на працягу трох гадоў.

Старшыня праўлення Белкаапсаюза паведаміла, што працягласць маршрутаў, па якіх курсіруюць аўтакрамы, вельмі вялікая — да 200 кіламетраў. І кіраўнік дзяржавы ставіў перад айчыннымі вытворцамі аўтапрама задачу, каб гэтыя крамы на колах адпавядалі ўсім санітарным, тэхнічным і тэхналагічным патрабаванням. Новая аўтакрама дазваляе забяспечыць дастаўку поўнага набору ўсіх неабходных тавараў. Мінімальны асартыментны пералік уключае ў сябе не менеш за 120 найменняў, але часцей за ўсё гэта лічба ў 4-5 разоў вышэй. Доля беларускіх тавараў складае парадку 90 %. Вядзецца таксама запіс папярэдніх заявак, а калі нехта не паспеў іх зрабіць на месцы, тавар можна заказаць праз кантакт-цэнтр ведамства.

— Сёння «кааператары» мабільныя, разумеюць тыя патрабаванні, мэты і задачы, якія перад імі стаяць. І вельмі ўдзячныя за падтрымку з боку дзяржавы. Гэта частка той сацыяльна арыентаванай палітыкі, якая праводзіцца ў Беларусі на працягу апошніх 30 гадоў, — рэзюмавала Інэса Караткевіч.

Найбольшую колькасць — дзевяць аўтамашын — атрымала Магілёўскае райспажыўтаварыства. Яно абслугоўвае чатыры раёны — Быхаўскі, Круглянскі, Магілёўскі, Бялыніцкі — і горад Магілёў. І вадзіцелі, і прадаўцы задаволеныя. Машына камфортная, прасторная, змяшчае ў сабе шмат халадзільнага і маразільнага абсталявання, што дазваляе дастаўляць жыхарам тавары, якія патрабуюць асаблівага тэмпературнага рэжыму, ёсць генератар для аўтаномнай работы, вялікая аглядная вітрына.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка адзначыў, што сістэма спажыўкааперацыі — найважнейшая галіна краіны і забеспячэнне сельскага насельніцтва якаснымі прадуктамі — адна з галоўных яе задач.

— Кіраўніком дзяржавы прыняты адпаведны ўказ, дзякуючы якому ў Магілёўскай вобласці закуплены новыя аўтакрамы, — аргументаваў старшыня аблвыканкама. — Налета мы працягнем закупку.

Анатоль Ісачанка паабяцаў, што значная падтрымка ведамству будзе аказана таксама ў рамонце стацыянарных крам і часткова па дастаўцы тавараў.

На сённяшні дзень сельскае насельніцтва Магілёўскай вобласці абслугоўвае 730 стацыянарных крам і 78 — на колах.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Ігар СЕРГЯЕНКА правядзе асабісты прыём грамадзян

13 студзеня ў Палаце прадстаўнікоў адбудзецца асабісты прыём грамадзян і прадстаўнікоў юрыдычных асоб Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігара Сергяенкі.

Папярэдні запіс будзе ажыццяўляцца з 8 да 10 студзеня з 08.00 да 17.00 (перапынак 13.00—14.00) па тэлефоне (017) 222-69-25.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
9 СТУДЗЕНЯ 2025 г.
ЧАЦВЕР
№ 1 (15990)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Марыя БУЛДА:

«Падабаецца кідаць сабе выклік»

Артыстка, матацыклістка і проста прыгажуня... Па аналогіі з вядомым фільмам так можна сказаць пра гэтую дзяўчыну. І нават больш: яна таленавітая і валодае цудоўным голасам, які ў 2024 годзе прывёў яе саліраваць у Вялікі тэатр Беларусі. Яркі дэбют маладой опернай артысткі на легендарнай сцэне не здарыўся знянацку. Нягледзячы на юны ўзрост, яна ўжо была лаўрэатам міжнародных конкурсаў, папрацавала з рознымі філарманічнымі калектывамі, акцёрскую загартоўку прайшла ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры. А душа хацела чагосьці больш складанага. Марыя наогул не шукае лёгкіх шляхоў, і, нягледзячы на зразумелы і натуральны для вакалістаў клопат пра галоўны інструмент — голас, яна стала ў Беларусі першай опернай спявачкай-байкершай...

— Падабаецца розная музыка, — прызнаецца Марыя. — Але ў нейкі момант падалося, што музычны тэатр мне бліжэй. Папрацаваўшы там, зразумела, што хочацца ў оперу: гэта больш цікава, але галоўнае — ёсць магчымасць развівацца, рабіць складаныя рэчы, творча расці. Убачыла летам конкурс на месца лірыка-каларатурнага сапрана. Дзякуючы Настассі Іграўне Масквіной я ведала, што патрэбна выканаўца партыі Царыцы ночы ў оперы «Чароўная флейта» Моцарта. Вырашыла паспрабаваць. Адмыслова займалася з канцэртмайстрам і кансультавалася з педагогам. Была гатовая і да таго, што нічога не атрымаецца. Думала: хоць паспрабую, бо гэта магчымасць неяк праявіць сябе. Мне здавалася, што я яшчэ вельмі маладая і недасведчаная для такой партыі. Але праслухоўванне прайшло паспяхова, мяне запрасілі праспяваць Царыцу ночы.

— Пасля дэбюту ў Вялікім пайшла звычайная праца, калі вас уводзяць у нейкія пастаноўкі. І ў салістаў пачынаецца: прызначаць — не прызначаць...

— У такіх выпадках я заўсёды сабе кажу: зраблю, што ў маіх сілах, як мага больш якасна. Заўсёды веру: калі цяпер не атрымалася, то пазней дакладна атрымаецца. Стараюся не апускаць рукі і лічу, што так павінен паводзіць сябе кожны чалавек, не толькі артыст. Калі ёсць дакладная мэта нечага дасягнуць, то трэба разумець, што атрымаецца, калі ты будзеш для гэтага нешта рабіць зноў і зноў. Бываюць праблемы, ці то рэжысёр незадаволены, ці то некаму нешта не спадабалася — гэта заўсёды турбуе любога артыста. Але трэба браць сябе ў рукі і ісці далей.

— Як прайшоў пераход з музычнага тэатра ў оперны? Там усё іншае — і сцэна, і зала, і трупа...

— Там меней людзей і адчуванне большай згуртаванасці. А тут іх шмат і пастаянна сустракаюцца асобы, якіх не ведаеш. Спачатку было страшнавата: тут людзі ўжо шмат працуюць, і кожны саліст звычайна хоча быць першым. Але з пункту гледжання чалавечых кантактаў, цеплыні я не заўважыла нейкіх праблем, атрымалася даволі хутка ўвайсці ў калектыў. Ад усіх адчувала падтрымку на сцэне — і з боку дырыжораў, і з боку партнёраў па сцэне. Ёсць узаемадапамога, бо ўсе хочуць выступіць добра — мы залежым адзін ад аднаго, калі працуем у спектаклі.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Час маладых

Наша сучаснасць і будучыня

Міжнародны круглы стол «Камунікацыя з дзяржавай у лічбавай прасторы: погляд моладзі» правялі ў Доме дружбы. Удзел у мерапрыемстве ўзялі знакамітыя беларускія вучоныя і практыкі, прадстаўнікі IT-індустрыі краін ЕАЭС, дыпламаты, студэнты-аналітыкі вядучых ВНУ краіны.

Тэма, якую абмяркоўвалі ўдзельнікі круглага стала, не проста актуальная, гэта трэнд сучаснага сусветнага развіцця, адзначыла напачатку мерапрыемства **Ніна ІВАНОВА, старшыня прэзідыума Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі**. «Эпоха лічбавізацыі адкрыла новыя магчымасці для ўзаемадзеяння паміж дзяржавай і грамадствам, а таксама стварыла перспектывы для эфектыўнага міжнароднага супрацоўніцтва. Думаю, што новыя тэхналогіі сфарміравалі асаблівую медыякультуру, да якой трэба прыстасоўвацца, якую трэба вывучаць», — падзялілася меркаваннем спікер.

Мадэратарам мерапрыемства выступіў **доктар хімічных навук, прафесар, член-карэспандэнт НАН Беларусі, член экспертнага савета старэйшын пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі Сяргей РАХМАНАЎ**. Ён адзначыў, што Беларусь з'яўляецца адным з сусветных лідараў у сферы інфармацыйных тэхналогій. «Гэта датычыцца не толькі аб'ёму паслуг на душу насельніцтва, якія мы ажыццяўляем у сферы інфармацыйных тэхналогій, бо мы таксама маем цэлы шэраг айчынных распрацовак, якія адпавядаюць вышэйшым сусветным стандартам. Нашы падыходы не маюць аналагаў».

Лічбавыя тэхналогіі — гэта важны складальнік сусветнага развіцця. Аднак, па словах Сяргея Кімавіча, акрамя пазітыўных момантаў, якія анансуюцца, выстаўляюцца напаказ, існуе і вельмі шмат пагроз, у якіх трэба разбірацца. Штучны інтэлект, віртуальная і дапоўненая рэальнасць, машыннае навучанне, лічбавыя платформы, электронны ўрад. Іх пазітыўныя бакі добра вядомыя. У іх ліку — адукацыя, навука, вытворчасць, кіраванне. Негатыўныя бакі, пра што гаворыцца мала, могуць прывесці да страты здольнасці думаць, дэградацыі мыслення, перспектывы лічбавага таталітарызму, прымітывізацыі соцыуму. Лічбавыя платформы аказваюць каласальны ўплыў на становішча спраў у свеце.

«Лічба — рэч, якая дапамагае зрабіць шмат карыснага і доўгага, калі яна ў экспертных руках. Трэба разумець, што настаў час, калі амаль усе жыхары планеты — спажыўцы лічбавых тэхналогій», — звярнуў увагу **начальнік управлення двухбаковага супрацоўніцтва з краінамі СНД і Грузіяй Міністэрства замежных спраў Аляксей САМАСУЕЎ**.

Удзельнікі круглага стала падчас выступленняў закраналі пытанні развіцця IT-тэхналогій у краінах СНД, грамадскай дыпламатыі і лічбавага асяроддзя, ролі моладзі ў лічбавізацыі. Таксама абмяркоўвалі стратэгіі лічбавага развіцця Беларусі на 2026—2030 гады, асноўныя кірункі лічбавізацыі і магчымасці практычнага прымянення. Закранулі тэму сацыяльных сетак і іх значэння ў фарміраванні іміджу дзяржавы.

Падчас круглага стала да ўдзельнікаў таксама звярнуўся **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол дзяржавы Палесціна ў Рэспубліцы Беларусь Ахмед Махамед аль-Мадбух**. У сваім выступленні ён нагадаў пра дэзінфармацыю і яе няўхільны ўплыў на розум маладых людзей. Па яго словах, каб супрацьстаяць фэйкам, варта наладзіць узаемадзеянне паміж моладдзю і органамі дзяржаўнага кіравання.

Важна памятаць, што менавіта камунікацыя дапамагае нам лепш разумець адно аднаго, выбудоўваць канструктыўнае ўзаемадзеянне і адносіны на ўсіх узроўнях. Без гэтага немагчыма прасоўваць сумесную дзейнасць.

«Самае важнае цяпер тое, што мы з вамі знаходзімся ў прагрэсіўнай лічбавай краіне, у Беларусі. Мы шмат увагі аддаём лічбаваму развіццю. Той пасыл, з якім звяртаецца наш Прэзідэнт да маладых людзей. Моладзь — наша сучаснасць. Ёй сёння жыць у лічбавым, турбулентным свеце. Выклікаў шмат, рызык шмат. Але раз мы, прадстаўнікі розных краін, сёння тут, значыць, развіццё і захаванне нашага грамадства магчымае, магчымае толькі ў адзінстве. Наша з вамі сіла — у адзінстве», — адзначыў **член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Павел ПАПКО**.

Напрыканцы мерапрыемства паміж удзельнікамі адбылася плённая дыскусія на тэму ўкаранення штучнага інтэлекту ў розныя сферы грамадскага жыцця. Вопытныя эксперты заклікалі моладзь з розумам выкарыстоўваць і аналізаваць усе найноўшыя тэхналогіі, а таксама параілі ўзбагачаць сябе ведамі рознага ўзроўню, выходзіць на новы ўзровень прапрацоўкі матэрыялаў па профілі, які будзе прадстаўляць цікавасць для іх асабіста і дзяржавы ў сучаснасці і будучыні.

Яна ВАЛАСАЧ.

ЗРАБІЦЬ ВЫБАР ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ

Крыху больш за два тыдні застаецца да важнага і адказнага кроку ў жыцці кожнага з нас — да выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Наш голас, аддадзены за аднаго з кандыдатаў, вызначыць маршрут краіны на бліжэйшыя пяць гадоў. Таму так важна рабіць яго ўзважана, асэнсавана і адказна. Чым будуць кіравацца ў гэтым пытанні прадстаўнікі маладога пакалення беларусаў, даведаліся нашы карэспандэнты.

Працаваць на сваю краіну

Сталічная моладзь — за моцную і квітнеючую Беларусь

Сёння наша краіна перажывае важны этап — электаральную кампанію. Беларусы выдатна разумеюць, што ўзяць удзел у выбарах, прыйсці на свой участак для галасавання і аддаць свой голас — тое, ад чаго будзе залежыць наша будучыня. Гэта грамадзянскі доўг кожнага жыхара нашай краіны. Важнасць электаральнай кампаніі выдатна разумее і наша моладзь, нават тыя, хто ўпершыню пойдзе галасаваць.

З ліку такіх — **студэнтка першага курса БДЭУ Мілана ЦЯШКО**. Дзяўчына мае актыўную грамадзянскую пазіцыю і падзялілася сваім меркаваннем наконт выбарчай кампаніі, а таксама сваімі планамі на будучыню. «У першую чаргу вельмі хачу ў будучыні трапіць у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. У мінулым я была дэпутатам Маладзёжнага парламента пры Шчучынскім райсавеце.

Хачу працаваць на карысць сваёй краіны і дапамагаць тым, хто мае патрэбу ў падтрымцы, развівацца ў дзяржаўнай дзейнасці. Нездарма кіраўнік дзяржавы адзначыў, што час выбраў нас. І ад таго, што будзе зроблена цяпер, будзе залежаць будучыня, — адзначыла студэнтка. — Я ведаю, што для таго, каб паспяхова рэалізавацца, трэба шмат вучыцца і працаваць, а той, хто валодае інфармацыяй, валодае светам. Цяпер у Беларусі праходзіць важная электаральная кампанія, таму для ўсіх нас асабліва важна выбіраць і фільтраваць атрыманую інфармацыю».

Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

«За гарантыі і развіццё дзяржавы»

І гэта вельмі важна, лічыць першы сакратар Слаўгарадскага райкама БРСМ Наталля ВАЛЫНЦАВА:

— Выбары — гэта важная падзея ў жыцці кожнай краіны. І для моладзі асаблівы гонар удзельнічаць у гэтым працэсе.

Наш горад невялікі, але вельмі прыгожы і ўтульны для жыцця. На тэрыторыі раёна знаходзіцца жамчужына Слаўгарадчыны — Блакітная крыніца — унікальны прыродны аб'ект. Дзякуючы кіраўніцтву краіны пабудаваны мост, які дае магчымасць наведваць гэтую славутасць на працягу года. Раней у зімовы перыяд дабрацца туды праз раку Сож было складана, а часам і немагчыма. Цяпер такой праблемы не існуе.

У нашым горадзе знаходзіцца вядомае на ўсю краіну сучаснае і высокатэхналагічнае прадпрыемства «Чырвоны харчавік — Слаўгарад», прадукцыя якога пастаўляецца за мяжу. На ім працуе шмат моладзі, якая прыехала ў райцэнтр пасля ВНУ па размеркаванні. Годная зарплата, добрыя ўмовы працы, ключы ад арэнднага жылля — усё гэта пасадзейнічала таму, што маладыя спецыялісты засталіся і працуюць на карысць Слаўгарада. Моладзь у нас у краіне наогул у прыярытэце. Без падтрымкі дзяржавы, без тых праграм, якія сёння рэалізуюцца, нам, маладым, было б цяжка ўсё гэта атрымаць, лічы, на першых этапах свайго самастойнага жыцця. Гэта вельмі стымулюе і матывуе маладых людзей.

Сёння мы жывём у мірнай, квітнеючай, незалежнай Беларусі і вельмі добра разумеем, што ад нас, маладога пакалення, залежыць яе будучыня. Я з упэўненасцю кажу, што 26 студзеня я пайду на выбары і аддам свой голас за таго кандыдата, які зможа і надалей гарантаваць стабільнасць і развіццё нашай дзяржавы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

«За мір і стабільнасць»

За гэта збіраецца галасаваць дырэктар Крычаўскага краязнаўчага музея, старшыня Маладзёжнага парламента пры Крычаўскім райсавеце дэпутатаў Уладзімір МІШЧАНКА:

— Моладзь з адказнасцю ставіцца да сваёй місіі аддаць голас за будучае краіны. Нам у ёй жыць і працаваць, — кажа ён. — Наш грамадзянскі доўг зрабіць выбар на карысць квітнеючай Беларусі. Каб яна і надалей дынамічна развівалася.

Самае галоўнае, мы жадаем жыць у мірнай, моцнай і незалежнай краіне. Сёння Беларусь прадстаўлена ў свеце ва ўсіх сферах. Мы і мірны атам скараем, і касмічную прастору даследуем. Перакананы, што будучае яшчэ больш вялікае. Яна краіна прадэманструе свае новыя дасягненні ў іншых прагрэсіўных кірунках. І ёю павінен кіраваць моцны Прэзідэнт, які зможа гарантаваць мір і стабільнасць, каб людзі былі ўпэўненыя ў заўтрашнім дні.

Для Крычава 2025 год знамянальны. Сёлета ў нас будуць праходзіць абласныя «Дажынкі», трэба як след падрыхтавацца. Летась ужо шмат чаго зрабілі для павышэння якасці жыцця жыхароў нашага райцэнтра. На працягу года ён будзе добраўпарадкоўвацца, будуць праводзіцца бягучыя рамонты, будавацца дарогі, тратуары.

Трэба цаніць тое, што робіцца для людзей кіраўніцтвам краіны. Вакол грымяць войны, народы канфліктуюць, а наша Беларусь у гэтых няпростых умовах развіваецца і нават больш хуткімі тэмпамі, чым гэта было раней. Выпрабаванні нас кансалідавалі, мы цэнім тое, што маем, і моладзь Крычава будзе і далей дэманстраваць гэтую згуртаванасць у канкрэтных справах на карысць горада і краіны. Будзем выступаць з праектамі і ініцыятывамі па паляпшэнні жыцця ў горадзе. Гэта наш унёсак у мірнае і стабільнае будучае краіны, за якое мы і збіраемся галасаваць.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Гонар і адказнасць казаць «Так!» таму, што важна

Настаўніца хіміі Вуцеўскай сярэдняй школы Добрушскага раёна Вольга САВЯНОК сваёй актыўнай грамадзянскай пазіцыяй вядомая не толькі ў сябе на малой радзіме. Маладая дзяўчына падтрымлівае ўсе знакавыя праекты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі і ўвогуле не застаецца раўнадушнай да грамадска значных падзей у краіне. Мінулы 2024 год у жыцці Вольгі быў надзвычай багатым у гэтым плане і вельмі адказным. Настаўніца сельскай школы стала дэлегатам Усебеларускага народнага сходу. Цяпер дзяўчына рыхтуецца стаць назіральнікам на ўчастку для галасавання на выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

— Цалкам падрыхтавалася выканаць гэтую важную місію, чакаю, але крыху хвалююся, вядома, бо гэта вельмі адказна, — падзялілася Вольга Савянок. — Абавязкова аддам свой голас у галасаванні, бо гэта адначасова і мой абавязак, і маё права як грамадзяніна. Перакананa, што настаўнік у прынцыпе не можа быць абыякавым чалавекам.

Маладому педагогу з Добрушчыны ўжо другі раз выпала магчымасць выступаць назіральнікам на выбарчым участку. Упершыню такі досвед у Вольгі быў падчас Адзінага дня галасавання.

— Зразумела, гэта цікава. Пераканалася, чаму неабходна разбірацца, як працуе выбарчае заканадаўства ў краіне. Было карысна паназіраць, як людзі прыходзяць аддаць свой голас. Цяпер мне выпаў гонар яшчэ і стаць членам ініцыятыўнай групы па зборы подпісаў для вылучэння Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі ў якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Удзельнічала ў зборы подпісаў не толькі на пікетах, але і па месцы жыхарства грамадзян, наведвала працоўныя калектывы. Гэта дало мне вельмі важны досвед і асабіста, і ў прафесійным, камунікатыўным плане, — распавяла маладая настаўніца.

Другі раз у жыцці Вольга будзе аддаваць свой голас на выбарах Прэзідэнта. Упершыню яна галасавала ў 2020 годзе.

— Цяпер мне ёсць з чым параўноўваць. Першы раз галасавала ў нейкай студэнцкай мітусні, кіравалася больш эмоцыямі. Цяпер адчуваю, што буду галасаваць ужо іншым чалавекам, больш асэнсавана. Мяне ўзбагаціў, даў магчымасць падужэць у грамадзянскай пазіцыі вопыт апошніх гадоў, калі ўдзельнічала ў дыялогавых пляцоўках, грамадска значных акцыях, мерапрыемствах. Гэта насамрэч вельмі важна для моладзі, — пераканана Вольга.

Дзяўчына падзялілася, што магчымасць максімальна ўключацца ў важныя для краіны падзеі дапамагла ёй не толькі больш разабрацца ў працэсе выбараў, стаць больш ідэалагічна падкаваным чалавекам.

— Але і больш свядома казаць «Так!» таму, што для цябе важна.

Чалавек заўсёды галасуе за тое, што хвалюе менавіта яго. Выбірае кандыдата, які зможа даць тое, што чакаюць яго родныя, блізкія. Удзел у выбарах — заўжды асабісты выбар. Усвядомленасць, уменне аналізаваць сітуацыю і падзеі навокал — а гэтаму неабходна вучыцца нам, маладым людзям, — дапамагаюць рабіць выбар не на нейкіх імгненных эмоцыях, не пад уплывам парываў юнацкага максімалізму, а цалкам асэнсавана. Я пайду галасаваць за мір, за нашу будучыню, за росквіт краіны.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота з архіва гераіні.

«Права і магчымасць уплываць на змены ў грамадстве»

Аляксандр БЫШНЁЎ, першы сакратар Віцебскага гарадскога камітэта ГА «БРСМ»:

«У 2025 годзе перад нашай краінай стаяць розныя выклікі — эканамічныя, сацыяльныя, экалагічныя. Вырашэнне гэтых праблем напрамую залежыць ад таго, які лідар будзе выбраны. Варта адзначыць, што ўдзел у прэзідэнцкіх выбарах — гэта не толькі права, але і магчымасць уплываць на палітыку і змены ў грамадстве. Мы як грамадзяне маем шанец выказаць сваё меркаванне, падтрымаць кандыдата, чые каштоўнасці адпавядаюць нашым поглядам, і ўнесці свой уклад у фарміраванне будучыні краіны.

Нарэшце, удзел у выбарах — гэта праява грамадзянскай адказнасці. Мы не можам прэтэндаваць на змены ў грамадстве, калі не ўдзельнічаем у працэсе. Разам мы фарміруем лёс нашай краіны, і чым больш грамадзян прымаюць у гэтым удзел, тым мацней і стабільней становіцца наша Беларусь.

Мы дастаткова дарослыя людзі, каб задумвацца аб заўтрашнім дні, а выбары Прэзідэнта — гэта якраз той выпадак, калі ад твайго голасу залежыць многае, у тым ліку твая будучыня, будучыня тваіх родных і блізкіх. Можна, вядома, адмахнуцца і заняцца іншымі справамі. А потым крыўдзіцца, што нешта ідзе не так, як хацелася б. Каб гэтага не здарылася, трэба выказвацца цяпер. Самы просты і правільны спосаб — прыйсці на будучыя выбары.

За 30 гадоў самастойнага, незалежнага шляху нашай краіны зроблена вельмі многае. Сёння мы не стаім у кіламетровых чэргах за дэфіцытнымі прадуктамі, амаль кожная сям'я мае аўтамабіль, з кожным годам Беларусь прырастае сучаснымі дзіцячымі садкамі і школамі. А калісьці нашы бацькі не маглі і марыць аб тым, што для нас з'яўляецца паўсядзённасцю. Сёння невялікая Беларусь вядома на міжнароднай арэне сваёй якаснай прадукцыяй машынабудаўнічай, тэкстыльнай, харчовай прамысловасці. А самае каштоўнае — нас, беларусаў, ведаюць як мірную і спакойную нацыю, якая першай ніколі не распачынала ваенныя канфлікты. З улікам таго, што зараз вакол нашых граніц складваецца нялёгкая сітуацыя, Прэзідэнт змог захаваць самае важнае для свайго народа — чыстае неба над галавой.

І кожнаму грамадзяніну нашай краіны, які пойдзе на выбары, таксама варта ўспомніць наш пройдзены шлях. І адказаць сабе на пытанне: «Ці будуць мае дзеці жыць у такой жа квітнеючай Беларусі?»

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.
Фота з адкрытых крыніц.

Моладзь XXI

НА КАРЫСЦЬ РАЗВІЦЦЯ СТАЛІЦЫ



Фота Лізаветы ГОЛАД.

Напрыканцы снежня ў Мінскім гарвыканкаме прайшоў фінал маладзёжнага праекта «Кіраўнік будучыні». У ім узялі ўдзел 30 студэнтаў БДУ. Восенню на працягу тыдня яны знаёміліся з работай дзяржслужачых па самых розных кірунках. Удзельнікі ўзаемадзейнічалі з кіраўніцтвам горада, задавалі пытанні і распрацоўвалі практыка-арыентаваныя праекты, якія ім неабходна было абараніць перад журы. Карэспандэнты «Чырвонкі» далучыліся да мерапрыемства, даведаліся аб новых праектах і іх аўтарах.

ІНІЦЫЯТЫВА І КАМАНДНАЯ РАБОТА

Прыняць удзел у маладзёжным праекце «Кіраўнік будучыні» — ініцыятыва студэнтаў БДУ, яе агучылі падчас сустрэчы са **старшынёй Мінскага гарвыканкама Уладзімірам КУХАРАВЫМ**. Аб гэтым расказала **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама Вольга ЧАМАДАНАВА**: «Напярэдадні мы запланавалі дадзенае мерапрыемства, і 30 студэнтаў універсітэта актыўна ўзялі ўдзел у праекце, дзе на працягу тыдня працавалі, можна сказаць, нароўні з намеснікамі старшыні Мінскага гарвыканкама і непасрэдна са старшынёй. Маладыя людзі выязджалі на аб'екты, вывучалі ўсе кірункі, якія мы сёння прапануем у рамках рэалізацыі розных праграм і праектаў горада Мінска. Пяць кірункаў былі асноватворнымі. Гэта і архітэктура, і эканоміка, і сацыяльна-эканамічнае развіццё горада, а таксама ідэалогія, ахова здароўя і іншае», — сказала яна.

І потым прэзентавалі пяць праектаў. «Мы яшчэ раз звярнулі ўвагу на работу дзяржаўных служачых, на ініцыятывы, якія ўжо рэалізуюцца ў рэальным жыцці. І ёсць вельмі вялікі патэнцыял і вялікае жаданне сёння ў моладзі як мага больш удзельнічаць у такіх праектах і ўносіць свае ініцыятывы. Мы гатовыя ахапіць, напэўна, студэнтаў кожнай ВНУ. Праектная дзейнасць становіцца ўсё больш папулярнай у студэнтаў. Гэта і магчымасць самарэалізацыі, і выдатная пляцоўка для моладзі не толькі сустрэцца, але і абмеркаваць актуальныя тэмы», — дадала Вольга Чамаданава.

ПАДТРЫМКА І РЭАЛІЗАЦЫЯ

Праект «Адзіны рэестр зваротаў грамадзян» прадугледжвае павышэнне эфектыўнасці работы са зваротамі. Анлайн-платформа «Мы разам» павінна спрыяць падтрымцы маладых спецыялістаў. Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў прапанаваў рэалізаваць гэты праект на базе бізнес-інкубатара. Гэта дазволіць значна знізіць выдаткі, паколькі не спатрэбіцца плаціць за арэнду, і маладым людзям акажуць дапамогу бухгалтары, юрысты і праграмісты. Праект «ЖКГ і энергетыка» накіраваны на распрацоўку комплексу мерапрыемстваў па папулярызацыі рабочых прафесій сярод моладзі.

Цікавасць старшыні Мінскага гарвыканкама выклікаў праект «Транспартная навігацыя». Студэнты распрацавалі і прадставілі схему трамвайных ліній для размяшчэння на прыпыначных пунктах. Уладзімір Кухараў прапанаваў маштабаваць праект на іншыя віды транспарту і стварыць інтэрактыўную карту руху гарадскога транспарту. Ён даў даручэнне сабраць усіх зацікаўленых і пачаць рэалізацыю праекта. Мэр горада адзначыў, што ў найбліжэйшых планах — размяшчэнне ў сталіцы спецыяльных інтэрактыўных прылад, якія дапамагаюць арыентавацца ў Мінску. І праект маладых людзей можа стаць часткай гэтай вялікай праграмы.

Пасля абароны прадстаўнікі Мінскага гарвыканкама прааналізавалі студэнцкія праекты, далі рэкамендацыі па іх дапрацоўцы і абяцалі дапамагчы ў рэалізацыі.

Даніїл ХМЯЛЬНІЦКІ.

ВЫСОКАЯ ПРАКТЫЧНАЯ АРЫЕНТАВАНАСЦЬ

Студэнт 3 курса БДУ Яраслаў ЛАНЬКО: «Я ўспрымаю праект «Кіраўнік будучыні» як новае ўліванне ў магчымасць развіцця маладзёжнай палітыкі. Прыемна, што БДУ з'яўляецца родапачынальнікам сумеснага праекта Мінгарвыканкама і нашага ўніверсітэта, які адкрывае новыя магчымасці развіцця маладзёжнага руху па розных кірунках дзейнасці».

Кіраўніком Яраслава па праекце стала **першы намеснік старшыні Мінскага гарвыканкама Надзея ЛАЗАРЭВІЧ**. «Мне было цікава наведаць розныя прадпрыемствы ў Мінску, у прыватнасці «Мотавелазавод», паглядзець на тое, як ён развіваецца, якія праблемы вырашае. Ну і, вядома, зрабіць свой праект у галіне эканомікі, — падзяліўся Яраслаў. — Мы распрацавалі сімулятар уплыву адных эканамічных паказчыкаў на іншыя. Карыстальнік можа змяняць, напрыклад, падатковыя стаўкі і ў рэальным часе сачыць за тым, як гэта ў гіпатэтычнай сітуацыі паўплывала б на ВУП краіны».

Студэнтка 3 курса юрыдычнага факультэта БДУ Варвара ПАРФЁНАВА: «На працягу тыдня мы пабывалі ў Мінскім гарвыканкаме і іншых сталічных аб'ектах. Я была ў секцыі па архітэктуры і горадабудаўніцтве. Наведалі рэканструкцыю кінатэатра «Масква», новую будоўлю ў раёне Сухарава, мелі зносіны з вышэйшымі службовымі асобамі Мінгарвыканкама, атрымалі бясцэнны вопыт, — адзначыла дзяўчына. — Мы маем шырокае ўяўленне пра тое, як працуюць нашы адміністрацыйныя органы, а цяпер паглядзелі на ўсё знутры. Самае галоўнае ў студэнцкія гады — удзельнічаць у любых ініцыятывах, якія прапануе ўніверсітэт. А БДУ і наша дзяржава сёння дазваляюць моладзі цалкам рэалізаваць сябе ў любой сферы».

Разам з іншымі студэнтамі Варвара распрацавала праект «Транспартныя камунікацыі», які прадугледжвае ўдасканаленне транспартных зносін у сталіцы. «Спадзяемся, што ў выніку вуліцы Мінска стануць больш напоўненыя маршрутнымі лістамі, дадатковымі трамваямі і іншым наземным транспартам», — заключыла дзяўчына.

«Падабаецца кідаць сабе выклік»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Чаму вырашылі з дырыжорскай спецыяльнасці перайсці ў вакальную?

— Ніколі не задумвалася пра дырыжорскую кар'еру, з дзяцінства цікавілі спевы і тэатр. У каледж на дырыжорскае мяне накіравалі бацькі. Яны ведалі, што я хацела спяваць. Насамрэч марыла быць эстраднай спявачкай і хацела паступаць ва ўніверсітэт культуры, а яны раілі атрымаць акадэмічную адукацыю. На момант паступлення я не ведала, што ёсць істотная розніца паміж вучобай на харавым і вакальным аддзяленні. Нават не разумела, што харавое — гэта, пасутнасці, дырыжорскае... Ужо на другім курсе каледжа зразумела, якая каласальная розніца паміж спевамі ў хоры і сольнымі. Вядома, спевы ў хоры маюць свой уплыў. Яны спрыяюць развіццю кругагляду, слухавога мыслення, а калі хочаш спяваць сольна, то трэба больш развіваць уласную вакальную прыроду.

Мне пашчасціла з настаўнікамі: вучылася ў людзей, якія ўмеюць працаваць з голасам. Не даводзілася надта цяжка пераломваць сябе, даволі хутка прыйшло разуменне, як трэба: і голас спрацаваў, і ўсё прыйшло ў норму.

— Ці «прымяралі» на сябе некаторыя партыі па меры таго як знаёміліся з операмі?

— Калі яшчэ не ведала нічога пра акадэмічны і эстрадны вакал, я глядзела савецкія фільмы. І мне з дзяцінства падабалася Адэль у «Лятучай мышы» Штрауса, уяўляла сябе ў гэтай ролі. Трапіла ў тэатр — і мне амаль адразу далі магчымасць выйсці ў партыі Адэлі. Здавалася, што гэта самая любімая і блізкая роля. Нейкія партыі прыйшлі, калі я вучылася ў каледжы, напрыклад Джыльда з «Рыгалета» запала ў душу і дагэтуль падабаецца музыка Вердзі. І музыка Пучыні. Нейкі час падабалася і музыка Вагнера, але да яе я пакуль не дарасла.

— Ці задаволены цяпер вашы бацькі?

— Мае бацькі — даволі строгія крытыкі. Тата музыкант, мама — не, але заўсёды знаходзілася ў культурным асяродку, глыбока адчувае і разумее музыку. Яны кажуць, што я змянілася каласальна, гэта чуваць і па голасе, і па маіх паводзінах на сцэне. Праца ў філармоніі і музычным тэатры дала пэўны досвед, а цяпер ідзе ўдасканаленне.

— Ці ёсць прыхільнікі, якія вас чулі раней на філарманічных канцэртах ці ў музычным, а цяпер ходзяць у оперны тэатр?

— Запрашала сяброў на свае канцэрты, калі яшчэ вучылася ў акадэміі. Пазней мне пашчасціла выступіць у філармоніі з камерным аркестрам пад кіраўніцтвам Яўгена Бушкова. Сумнявалася, ці трэба запрашаць сяброў не з творчага асяродку, бо ў праграме была музыка Яфрэма Падгайца, вельмі складаная для ўспрымання, але я рызыкнула. Яны засталіся ў захапленні і выказалі жаданне прыходзіць яшчэ. Літаральна праз кароткі час здарыўся мой дэбют у партыі Царыцы ночы. Зноў спадабалася. Сталі хадзіць на мае спектаклі. Некаторыя з іх з музыкай не звязаны, але ў нас ёсць іншыя агульныя інтарэсы. Гэта тысяцца маіх матацыклетных прыгод.

— Вы павінны баяцца за сябе і свой голас. Як жа абралі такое небяспечнае хобі?

— Падчас вучобы ў аўташколе, калі вывучала Правілы дарожнага руху, то зацікавілася магчымасцямі перасоўвання. Сама назбірала і падабрала недарагі і далёка не новы, але надзейны матацыкл. Бацькі, вядома, былі катэгарычна супраць і па сённяшні дзень спадзяюцца, што гэта неўзабаве скончыцца. А ў тэатры да майго захаплення паставіліся са здзіўленнем і цікавасцю.

Матацыкл для мяне — зручны транспартны сродак, які дазваляе хутка дабірацца да месца. Па карках я магу прабірацца хутчэй, чым аўтамабілі. На матацыкле нават больш цёпла, чым хадзіць па вуліцы ў такое надвор'е: некалькі слаёў вопраткі, можна закрыцца з усіх бакоў, у твар нічога не дзьме — ратуе шлем. Бывае прахалодна, але дыскамфорту я не адчуваю. Калі пра боязь за сябе... Лічу, што жыццё наогул небяспечнае, што заўгодна можа здарыцца ў любы момант. Ніхто не застрахаваны ад траўмаў, нават бытавых. Аднойчы ў музычным тэатры я падвярнула нагу — паслізнулася на роўным месцы. Вядома, на матацыкле атрымаць траўму больш верагодна, але стараюся паводзіць сябе акуратна, удасканальваю навыкі кіроўцы.

— Вам і ролі драйвовыя падабаюцца?

— Мне падабаецца кідаць сабе выклік. Калі адчуваю, што з чымсці не проста справіцца, то ўзнікае азарт: значыць, абавязкова трэба адолець!

Ларыса ЦІМОШЫК.
Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by
Фота: Вялікі тэатр Беларусі.

Свой выбар

Сюды прыходзяць не толькі па каву...

У сучасным грамадстве інклюзія паступова становіцца неад'емнай часткай жыцця, адкрываючы новыя гарызонты для людзей з інваліднасцю. Адным з яскравых прыкладаў гэтай тэндэнцыі з'яўляецца інклюзіўная кавярня ў Мінску, дзе разнастайнасць становіцца сілай, а кава — сімвалам адзінства і ўзаемаразумення.

Першапачаткова праект быў створаны актывістам-калясачнікам Аляксандрам Аўдзевічам і называўся «Інклюзіўны барыста». Асноўная сутнасць праекта заключалася ў навучанні людзей з інваліднасцю прафесіі барыста. Але праз нейкі час стала зразумела, што аднаго навучання мала, патрабуюцца яшчэ і спецыялізаваныя кавярні, дзе могуць працаваць навучэнцы гэтага курса. Уласна кажучы, рэалізацыя задумы не прымусіла сябе доўга чакаць. Першая кавярня адкрылася ў Магілёве, а пасля сетка пачала пашырацца і ў іншых гарадах Беларусі. Што немалаважна, усе кавярні адразу скарылі сэрцы кліентаў. Людзі з задавальненнем прыходзяць туды не толькі па смачную каву, але і пакантактаваць.

Мы апынуліся ў гасцях адной са сталічных кавярняў і першым супрацоўнікам, з якім нам удалося пагутарыць, стаў менеджар Васіль Паўлікаў. У хлопца сіндром Даўна, але са сваімі абавязкамі ён спраўляецца выдатна. Менавіта з ім мы дамовіліся аб інтэрв'ю, а цяпер ён пазнаёміў нас з калектывам. Старажылам сярод барыста з'яўляецца Наталля Астаніна. У дзяўчыны захворванне ад нараджэння — анамалія спіннога мозгу і пазваночніка, з дзяцінства яна перасоўваецца на калясцы. Наталля была першай, хто прыступіў да працы.

— На момант адкрыцця нашых кавярняў гэтая тэма была даволі новая і цікавая. Мы атрымлівалі шмат паведамленняў, што людзі хочуць працаваць у нас, — успамінае дзяўчына. — Зразумела, усіх, на жаль, мы ўзяць не маглі. Адбіралі па магчымасцях, бо барыста — гэта прафесія не толькі пра выраб кавы, але і пра зносіны з людзьмі. І не ўсе калясачнікі былі да гэтага гатовыя. Да таго ж тут яшчэ і вельмі цяжкая фізічная праца, бо ў дзень мы варым сотні кубкаў кавы. Свой першы працоўны дзень я памятаю, але ён не быў для мяне нейкім асаблівым. Усё таму, што я мела вопыт працы ў іншых кавярнях і не толькі. Аднак, нягледзячы на гэта, лёгкае хваляванне ўсё роўна прысутнічала. Цяпер я ўжо на сто працэнтаў упэўнена ў сваіх сілах, спакойна магу прыгатаваць кліентам смачную каву, і ў цэлым мая прафесія прыносіць мне толькі задавальненне. Адзіная цяжкасць, з якой даводзіцца сутыкацца, — гэта дарога на работу, асабліва ў дрэннае надвор'е.

Кавярню прыйшлося будаваць з дадатковымі нормамі, каб усе барыста маглі працаваць у камфорце. Так, напрыклад, улічваліся вышыня і шырыня аб'ектаў, каб супрацоўнікі маглі дацягнуцца да патрэбных рэчаў. Ну і, вядома, прастора самога памяшкання: каб, перасоўваючыся на калясках, барыста не перашкаджалі адзін аднаму.

Яшчэ нам удалося пагутарыць у перапынку паміж наведвальнікамі з Дар'яй Захаранкавай. З праграмай інклюзіўнай кавярні дзяўчына пазнаёмілася ў 2019 годзе, калі ў Віцебск, адкуль яна родам, прыехаў заснавальнік кафэ разам з Наталляй праводзіць майстар-клас, пасля якога Дар'ю і запрасілі на работу.

— Вядома, спачатку было страшнавата, былі сумненні, бо мне трэба было выйсці з зоны камфорту. На той момант прайшло гады два пасля траўмы, якая прыкавала мяне да інваліднага крэсла. І ўвесь гэты час я жыла ў цяплічных умовах, у сям'і. Але я ўсё ж вырашыла рызыкнуць, і гэта цалкам апраўдалася. Не скажу, што працаваць лёгка. У нас вялікі паток кліентаў, і часам за перапынак проста не паспяваеш адпачыць. Але лічу, што ўсе складанасці перакрываюць такі плюс, як сацыялізацыя. Праца ў кавярні дае магчымасць быць у соцыуме і не сядзець дома.

Акрамя смачнай кавы і натхнення ў кавярні таксама можна набыць шоперы з малюнкамі юных мастакоў з аўтызмам. А ў свабодны ад працы час калектыў з радасцю наведвае розныя мерапрыемствы і творчыя сустрэчы ў якасці запрошаных гасцей і спікераў. Бо яны служаць сапраўдным прыкладам таго, што пры жаданні развівацца няма нічога немагчымага.

Ангеліна НОВІКАВА,
фота аўтара.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі газеты — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда», грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
E-mail: info@zviazda.by

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД № 38200000007667 ад 03.04.2004.
220013, г. Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 12.698.
Нумар падпісаны ў 19.30 08.01.2025 г.

СЯМЕЙНЫ КАПІТАЛ: НАВАЦЫІ Ў КАРЫСТАННІ

Магчымасці для датэрміновага выкарыстання сродкаў сямейнага капіталу ў Беларусі пашырыліся

Нагадаем, што кіраўнік дзяржавы падоўжыў тэрмін дзеяння Праграмы сямейнага капіталу яшчэ на пяць гадоў: з 1 студзеня 2025 года да 31 снежня 2029 года.

Якія навацыі з'явіліся ў дзеянні Праграмы, расказалі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

У прыватнасці, скарыстацца самастойна магчымасцю без накіравання выканкамам.

– Датэрмінова выкарыстоўваць сямейны капітал на ўзвядзенне жылля ў шматкватэрных жылых дамах, у тым ліку на пагашэнне крэдытаў (пазык), узятых на гэта ўзвядзенне, змогуць сем'і (грамадзяне), якія будуюцца альбо пабудавалі кватэру самастойна без накіравання рай(гар-)выканкама, – патлумачылі ў ведамстве.

Умовы сталі мякчэй. Так, больш лаяльнымі сталі ўмовы па ўліку ва ўласнасці жылля для прадастаўлення права на датэрміновае выкарыстанне сямейнага капіталу для паляпшэння жыллёвых умоў. Цяпер у агульнай плошчы жылля, якое знаходзіцца ва ўласнасці сям'і, не будуць улічвацца жылыя памяшканні, прызнаныя не адпаведнымі ўстаноўленым для пражывання санітарным і тэхнічным патрабаванням.

Змяніўся падыход і да набыцця долі (доляў) жылых памяшканняў. У прыватнасці, прадастаўлена магчымасць датэрмінова выкарыстоўваць сямейны капітал на набыццё долі (доляў) жылых памяшканняў, калі ў сям'і ўжо маюцца ва ўласнасці долі гэтых жылых памяшканняў, замацаваныя за некалькімі членамі сям'і.

Ёсць навацыі і па вяртанні крэдыту.

– Прадастаўлена права датэрміновага выкарыстання сямейнага капіталу на вяртанне крэдыту, атрыманага ў парадку рэфінансавання для пагашэння запазычанасці па раней заключаным крэдытным дагаворы на фінансаванне ўзвядзення, рэканструкцыі, набыцця жылля.

Што датычыцца ўмоў, на якіх дзейнічае такая навацыя, то ўлічваюцца стан на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў; адсутнасць ва ўласнасці жылля, агульная плошча якога складае 15 кв. м (у горадзе Мінску – 10 кв. м) і больш на аднаго чалавека, і іншыя ўмовы.

– Гэтыя ўмовы разглядаюцца на дату заключэння першаснага крэдытнага дагавора, атрыманага на ўзвядзенне, рэканструкцыю, набыццё жылля, – дадалі ў Мінпрацы.

Таксама зменамі ў Праграму сямейнага капіталу прадугледжана магчымасць аплаціць навучанне не толькі за бягучы і папярэдні навучальны год, але і за будучы перыяд.

Акрамя таго, стаў шырэй пералік тавараў, якія можна набыць для членаў сям'і з інваліднасцю і парушэннямі зроку. Так, пералік дапоўнены электроннымі асістыўнымі прыладамі для арыентацыі, акустычнымі асістыўнымі прыладамі для навігацыі і асістыўнымі прыладамі для прагляду (відэасістэмамі, якія павялічваюць малюнак).

Што датычыцца памеру сямейнага капіталу, то ён падлягае штогадовай індэксацыі з нарастаючым вынікам на велічыню індэкса спажывецкіх цэн за папярэдні год.

– Новы памер сямейнага капіталу, які дзейнічае з 1 студзеня 2025 года, будзе размешчаны на афіцыйным сайце Мінпрацы да 31 студзеня 2025 года, – адзначылі ў ведамстве.

Маргарыта ЗАРОЎКІНА.

ПАШЫРАНЫ СПЕКТР ПЛАТНЫХ ПАСЛУГ У ДЗЯРЖАЎНЫХ МЕДУСТАНОВАХ

Пры гэтым аб'ём бясплатнай дапамогі застанецца ранейшым

Урад удасканаліў парадак аказання платных медыцынскіх паслуг у дзяржаўных установах аховы здароўя.

Пасля паспяховага эксперымента, які праводзіўся з вясны 2022 года ў пары дзясяткаў дзяржустаноў, з бягучага года вырашана яго пашырыць на больш шырокае кола ўдзельнікаў. На жаданні грамадзян дзяржаўныя медустановы могуць аказваць платныя паслугі ў выхадныя і святочныя дні, а колькасць такіх арганізацый павялічыцца да 265. Пералік саміх медыцынскіх паслуг таксама павялічваецца за кошт найбольш запатрабаваных медыцынскіх умяшанняў – пераважна хірургічнага профілю і дыягнастычных даследаванняў. Аказвацца яны будуць у дзяржустановах, якія маюць неабходную матэрыяльна-тэхнічную базу і кадравы патэнцыял.

Адпаведную пастанову дня мі падпісаў прэм'ер-міністр Беларусі Раман Галоўчанка. Яе рэалізацыя дазволіць прапановаць грамадзянам альтэрнатыву прыватным медыцынскім цэнтрам, што аказваюць платныя паслугі па высокіх цэнах, павысіць узровень заработнай платы медыцынскіх работнікаў, якія ўдзельнічаюць у аказанні такіх паслуг, а таксама больш эфектыўна выкарыстоўваць медыцынскае абсталяванне.

Пры гэтым гарантаваны аб'ём бясплатнай дапамогі, як адзначылі ў Міністэрстве аховы здароўя, не зменіцца: «Медыцынская дапамога, як і раней, будзе прадастаўляцца беспярашкодна, бясплатна ў поўным аб'ёме і на тых жа ўмовах, што дзейнічалі дагэтуль».

Сярод платных працэдур – гінекалагічныя, уралагічныя, афтальмалагічныя, нейрахірургічныя, атарыналарынгалагічныя, рэнтгенхірургічныя, рэканструктыўныя, артапедычныя, траўматалагічныя, сківічна-тваравыя, агульнахірургічныя, практолагічныя, эндаскапічныя. Дакумент таксама замацоўвае норму, якая дазваляе грамадзянам пры жаданні выкарыстоўваць анестэзіялагічную дапамогу пры атрыманні платных медпаслуг.

Алена КРАВЕЦ.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (Организатор аукциона) по поручению Гомельского филиала РУП почтовой связи «Белпочта» (Продавец) извещает о проведении 23 января 2025 года открытого повторного аукциона с понижением цены на 50 % по продаже имущества на праве хозяйственного ведения в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, каб. 2-9

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи без учета НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка без учета НДС (20 %), бел. руб.
Условия предоставления рассрочки платежа: первоначальный платеж – 50 % цены продажи Лота с учетом ранее внесенной суммы задатка; срок оплаты первоначального платежа – не позднее 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи. В случае приобретения имущества в рассрочку, оплата стоимости приобретенного имущества предоставляется в соответствии с законодательством. Реализованное на аукционе имущество находится у Продавца (РУП «Белпочта») до окончательного расчета Победителя аукциона по договору купли-продажи			
2	**Автомобиль** грузопассажирский фургон **UAZ 390995-330,** регистрационный знак АІ2918-3, инв. по бух. учету № 504000024, VIN 390900B0201769 XTT390995B0420218, пробег 523 000 км, находящийся по адресу: Гомельская обл., Мозырский район, г. Лельчицы, ул. Советская, 23. Ранее данный автомобиль использовался на почтовых маршрутах. Внешнее состояние неудовлетворительное. Коррозийное разрушение кузова, крыльев, дверей. Двигатель имеет предельный износ (низкая компрессия и давление масла). Задний и передний мосты имеют предельный износ главной пары и подшипников, ведомой и ведущей шестерни. ГТО до 04.05.2025 г.	2 030,89	203,09
3	**Автомобиль** грузовой фургон **Рено Кенгу,** регистрационный знак АВ 3019-3, инв. по бух. учету №504260012, VIN VF1FC0JCF38703916, пробег 384 000 км, находящийся по адресу: Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Первомайская,76. Ранее данный автомобиль использовался на почтовых маршрутах. Внешнее состояние неудовлетворительное. Двигатель имеет предельный износ (низкая компрессия и давление масла, повышенный расход масла). Коробка перемены передач имеет предельный износ деталей: износ валов, шестерен и подшипников, люфт подшипников в корпусе. Требуется капитальный ремонт или замена. ГТО до 11.07.2025 г.	2 124,89	212,49

Продавец: Гомельский филиал РУП «Белпочта», 246048, г. Гомель-48, ул. Советская, 8.

Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) осуществляется по контактному тел.: **8 (0232)29-38-97 Щеглов Сергей Николаевич.**

Шаг аукционных торгов – 5 % (пять) от начальной цены предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (Гомельский филиал РУП почтовой связи «Белпочта»):** р/с BY35 AKBB 3012 0210 2005 4310 0000, в ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, BIC AKBBBY2X, УНП 400395996, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №__ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). Код назначения платежа – 40901 «Перечисление гарантийного взноса».

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 09 января 2025 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Формы заявления и соглашения можно предварительно запросить у Организатора аукциона по электронной почте expert-usluga.by@mail.ru.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 21 января 2025 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения. Победитель аукциона либо единственный участник, согласные приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на **5** % (далее – Претендент на покупку) обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; возместить Организатору аукциона затраты на организацию и проведение торгов, Продавцу затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **5 (пяти) календарных дней** со дня проведения аукциона (после предъявления Продавцу копии платежного документа, подтверждающего возмещение Организатору аукциона стоимости затрат на организацию и проведение аукциона), оплатить стоимость приобретенного имущества в течение **5 (пяти) календарных дней** с даты заключения договора купли-продажи, за исключением оплаты стоимости приобретенного имущества в рассрочку. Порядок проведения аукциона определен Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 г. № 609 «Об утверждении Положения о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности».

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 26.11.2024 г. № 230 (30364).

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах: организатора аукциона –www.expert-usluga.by (раздел «Аукционы»); Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by/ в разделе «Продажа/Аренда имущества».

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-56, 8 (044) 599-18-16.

ООО «Деловая оценка» (Организатор аукциона) по поручению **Добрушского РайПО** (Продавец) извещает о проведении **21 января 2025 года** открытого повторного аукциона по продаже имущества **в 12.00** по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2

Лот № 1: Капитальное строение с инв. № 311/С-50225, общей площадью 176 кв. м, наименование – магазин № 11, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное, блочное, облицованное кирпичом, с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321287202102000088, площадью 0,0790 га, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Утевский с/с, п. Степь (магазин)

Капитальное строение с инв. № 311/С-52019, общей площадью 135,7 кв. м, наименование – магазин № 16, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – одноэтажное, кирпичное, с кирпичной пристройкой здание магазина, с надворными постройками: сараем, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321255700001000507, площадью 0,0414 га, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, Утевский с/с, п. Степь, ул. Залинейная, магазин № 16. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды

В состав лота входит оборудование в количестве 12 ед.
Перечень имущества опубликован на сайте **www.deloocenka.by**

Начальная цена продажи без НДС – 5 506,50 бел. руб. **Задаток** – 55,07 бел. руб.

Лот № 5: Капитальное строение с инв. № 311/С-53371, общей площадью 140,7 кв. м, наименование – магазин № 27, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – Б1/к-Пристройка, 1-Уборная, А1/к-Магазин, а-Калитка, б-Ограждение, в-Ограждение, г-Ворота, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 321250100001002939, площадью 0,0308 га, расположенное по адресу: Гомельская обл., Добрушский р-н, г. Добруш, ул. Советская, 67А. Капитальное строение сдано в аренду по договору аренды

Лот включает ТОРГОВЫЕ РЯДЫ РЫНОК ФАРФ.З-Д, инв. № 452/3662, демонтаж и вывоз осуществляется силами и за счет покупателя

Начальная цена продажи без НДС – 7 248,82 бел. руб.
Задаток – 72,49 бел. руб.

Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, государственной регистрации договора купли-продажи и перехода права на предмет аукциона возлагаются на Победителя аукциона

Продавец: Добрушское РайПО,
г. п. Тереховка, ул. Вокзальная, 47.
Конт. тел. +375 (232) 34-98-92,
+375 (44) 590-84-01.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота в фиксированной сумме.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона ООО «Деловая оценка»: р/с BY60BELB30121322650030226000 в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, пр-т Ленина, 10, БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 20.01.2025 г. в 16.00.

Порядок участия и проведения аукциона с перечнем необходимых документов опубликован на сайте **www.deloocenka.by.**

Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения.

Единственный участник имеет право приобрести лот с шагом 5 %.

Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) рабочих дней** с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати) календарных дней** с момента проведения торгов. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости предмета оценки. Указанные объекты никому другому не проданы, не заложены, под запретом не состоят, судебного спора о них не имеется, других владельцев нет. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Конт. тел. организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62.

КЛЮЧАВЫ ФАКТАР ПОСПЕХУ

Як працоўны калектыў становіцца камандай?

Каманда — ключавы фактар поспеху любога прадпрыемства. Але, каб згуртаваць людзей, неабходна натхняльнае і камфортнае асяроддзе на працоўным месцы для кожнага.

Прыкладам паспяховай працы ў гэтым кірунку ў Бабруйскім раёне называюць Бабруйскі завод трактарных дэталяў і агрэгатаў. Пра тое, як на прадпрыемстве ствараецца і падтрымліваецца карпаратыўная культура, мы размаўляем з **намеснікам дырэктара па ідэалагічнай рабоце, сацыяльным развіцці і рабоце з персаналам ААТ «БЗТДіА» Наталляй ДЗЮБАЙ.**



На ААТ «БЗТДіА» 234 супрацоўнікі ва ўзросце да 31 года, з іх 29 маладых спецыялістаў. І калі ў мінулым годзе ў прадпрыемства было заключана 20 мэтавых дагавораў на падрыхтоўку маладых спецыялістаў, то сёлета — ужо 27. Жыццё прадпрыемства — гэта самыя розныя мерапрыемствы, ад канцэртаў да конкурсаў і спаборніцтваў. Людзі з задавальненнем адгукаюцца на гэтыя актыўнасці.

— Наталля Вітальеўна, якая ідэя ў аснове фарміравання працоўных традыцый на заводзе?

— Задача наймальніка — не толькі прыцягнуць персанал, але і ўтрымаць яго, стварыўшы ўмовы для самаразвіцця, выканання задач, забеспячэння фінансавага дабрабыту. Але важна, каб на прадпрыемстве прыходзілі менавіта прафесіяналы. Для вызначэння ўзроўню кандыдатаў на працаўладкаванне праводзіцца кадравы дзень. У прысутнасці дырэктара, намеснікаў дырэктараў па кірунках, начальніка кадравай службы, начальнікаў структурных падраздзяленняў праходзяць гутаркі, па выніках якіх прымаюцца рашэнні аб прыёме на работу. На такіх нарадах разглядаюцца і пытанні пераводу работнікаў на іншыя пасады, іх росту па кар'ернай лесвіцы.

Значнай лічым работу з кадравым рэзервам. Вялікая ўвага аддаецца сістэме павышэння кваліфікацыі. У канцы года рыхтуецца загад па навучанні на наступны год, актуалізуюцца спісы настаўнікаў, складаюцца планы навучання. Па яго выніках вядучы інжынер па падрыхтоўцы кадраў «экзаменуе» навучэнца, каб вызначыць актуальнасць атрыманых ведаў і пры неабходнасці скарэктаваць навучальныя праграмы.

БУДУЧЫНЯ НАЛЕЖЫЦЬ МАЛАДЫМ

— І тут напрошваецца пытанне аб рабоце з моладдзю: маладыя кадры шмат у чым вызначаюць інавацыйнасць і тэхналагічнасць вытворчых рашэнняў.

— Я не прымяншала б значэння вопытных, «дарослых» кадраў. Але, сапраўды, рабоце з моладдзю на прадпрыемстве ўдзяляецца пільная ўвага. Пакуль моладзі ў нас не настолькі шмат, як хацелася б: з 2136 чалавек 234 супрацоўнікі ва ўзросце да 31 года, з іх 29 маладых спецыялістаў. Аднак, думаю, сітуацыя ў гэтым кірунку будзе змяняцца да лепшага. Супрацоўнікі кадравай службы пры ўзаемадзеянні з установамі адукацыі актуалізуюць заяўкі на падрыхтоўку спецыялістаў у сістэме дзяржзаказу. Праводзяцца прафарыентацыйныя мерапрыемствы з навучэнцамі школ, класаў інжынерна-тэхнічнай накіраванасці гімназій, прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных устаноў адукацыі, дні адкрытых дзвярэй. Арганізуюцца экскурсіі, дзе навучэнцы знаёмяцца са спецыфікай працы, тэхналагічнымі працэсамі, вакансіямі. Праводзяцца «кірмашы мэтавых месцаў»: сёлета ў іх узялі ўдзел 180 чалавек. Па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў узаемадзейнічаем з вядучымі ВНУ краіны па нашым профілі (БНТУ, ДДТУ імя Сухога, БРУ і г. д.). Распрацавана Палажэнне аб стыпендыі навучэнцам, якія атрымліваюць адукацыю на ўмовах мэтавай падрыхтоўкі. Яна складае ад трох да сямі базавых велічынь за семестр у залежнасці ад паспяховасці студэнта. І калі ў мінулым годзе было заключана 20 мэтавых дагавораў на падрыхтоўку маладых спецыялістаў, то сёлета — ужо 27.

— За маладыя кадры зараз «спаборнічаюць» многія прадпрыемствы...

— І наш завод — не выключэнне, але мы гатовы шмат прапанаваць. Так, маладому спецыялісту, які атрымаў у нас першае працоўнае месца, на працягу двух тыдняў выплачваецца грашовая дапамога. Пасля сярэдняй спецыяльнай навучальнай установы — у памеры тарыфнай стаўкі па прысвоенай кваліфікацыі (разрадзе), пасля ВНУ — у памеры месячнай стыпендыі. Калі малады спецыяліст прыбыў для працы на прадпрыемства па запрашэнні, то пасля ССНУ яму робіцца даплата ў памеры трох базавых велічынь, а пасля ВНУ — у памеры чатырох. Ёсць і іншыя выплаты. Напрыклад, пры ўмове выканання даведзеных заданняў для маладых спецыялістаў прадугледжана павышэнне прэміі: у першы месяц работы — на 40 %, у другі — на 30 % і г. д. Заўважу, што пры працаўладкаванні персаналу дэфіцытных спецыяльнасцяў (незалежна ад узросту) выплачваецца аднаразовая ўзнагарода ў памеры двух мінімальных заробкаў. Іншагароднія супрацоўнікі могуць атрымаць беспрацэнтны аванс на добраўпарадкаванне ў суме да адной тысячы рублёў або пакрыццё грашовых сродкаў на аплату здымнага жылля. А за інавацыйную дзейнасць для нашай моладзі ўстаноўлена павышэнне акладу. Да Дня машынабудаўніка штогод прымеркавана «Прысвячэнне ў маладыя спецыялісты», на якім яны атрымліваюць каштоўныя падарункі. Дарэчы, падарункі і грашовыя выплаты ў нашым калектыве да розных свят прадугледжаны для ўсіх. Яшчэ адна форма працы — прафесійныя конкурсы «Найлепшы ў прафесіі». І дарэчы, у наступным годзе плануецца стварэнне Савета маладых спецыялістаў прадпрыемства, у якога будуць значныя паўнамоцтвы.

— Клапоцячыся аб моладзі, нельга забываць і аб ветэранах прадпрыемства.

— Мы і не забываем. Сацыяльнай сферы на прадпрыемстве аддаецца пільная ўвага. У прыватнасці, штомесяц рыхтуюцца загады па аказанні матэрыяльнай дапамогі ветэранам прадпрыемства ў сувязі з юбілейнымі датамі. Супрацоўнікам, якія ідуць на заслужаны адпачынак, ва ўрачыстай абстаноўцы ўручаюцца каштоўныя падарункі.

НЕ ТОЛЬКІ ПРАЦА

— Але ж карпаратыўная культура вымяраецца не толькі грашыма...

— Мы клапоцімся аб тым, каб людзі з радасцю ішлі на работу і мелі ўсе ўмовы для эфектыўнай працы. Важна, каб і свабодны час супрацоўнікі звязвалі з заводам. Так, заключаны дагаворы на аказанне паслуг з фізкультурна-аздараўленчым комплексам «Тэхас», фітнес-клубам «Ева», шэрагам паліклінік горада (на стаматалагічныя паслугі, ультрагукавую дыягностыку, вакцынацыю). Да паслуг работнікаў — наш здраўпункт (масажны, фізіятэрапеўтычны і стаматалагічны кабінеты з найноўшым медыцынскім абсталяваннем). Фізкультурна-аздараўленчы комплекс прадпрыемства бясплатны для завадчан, ён абсталяваны трэнажорнай залай, заламі для гульні ў настольны тэніс і більярд, парыльняй, басейнам, чайнай. Ёсць пляцоўка для гульняў у міні-футбол, тэніс, валейбол — тут праводзяцца трэніроўкі і праходзяць, заўсёды весела і відовішна, заводскія спаборніцтвы. Штодня комплекс наведвае больш за 30 чалавек: супрацоўнікі завода і нашы пенсіянеры.

А ў цэлым жыццё прадпрыемства — гэта не толькі спорт, але і самыя розныя мерапрыемствы: ад канцэртаў да конкурсаў. Людзі з задавальненнем адгукаюцца на гэтыя актыўнасці. Мы выкарыстоўваем магчымасці сацыяльных сетак. Штатным псіхолагам прадпрыемства вядзецца маніторынг задаволенасці персаналу. На яго выніках прымаюцца меры па паляпшэнні ўмоў працы і адпачынку. Лічым, што менавіта так, «па цаглінцы», з асобных людзей ствараецца каманда, дзе кожны адчувае, што яго ўклад у агульны поспех важны і значны.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 2, УНП 191021390
Продавец	ОАО «Гипросвязь», г. Минск, ул. Сурганова, 24, комн. 219. УНН 100230534
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, 40, пом. 46, оф. 1 (**www.ipmtorgi.by**)
Предмет электронных торгов	
Легковой специальный универсал SKODA YETI (рег. знак 9146 НІ-7, 2013 г. в.). Месторасположение: г. Минск, ул. Сурганова, д. 24	
Начальная цена с НДС – 25 200,00 бел. руб. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены	
Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191 021 390. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней со дня завершения электронных торгов	
Условия оплаты предмета электронных торгов: в течение **10 (десяти) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**	
Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившиеся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязаны возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **6 %** от цены продажи лотов в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее, чем за один день до наступления даты проведения аукциона	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: с 11.00 до 12.00 11.02.2025 г. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов	
Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 10.02.2025 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by	
Контактные телефоны: +375 (17) 310-36-37; +375 (29) 154-34-35, auction@cpo.by	

ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества **СП «ПРОМЕКС» ООО** (УНП 100349659), объявляет о проведении **21.01.2025 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке **bankrot-torg.by.**

Предмет торгов	Начальная стоимость, бел. руб. с НДС
Завод по розливу питьевой воды в п. Городище (73/100 доля в праве)	3133890,00
База отдыха и оздоровления в п. Городище	3291840,00
Машино-место, общ. пл. 13,9 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-327	24192,00
Машино-место, общ. пл. 26,7 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-328	29700,00
Машино-место, общ. пл. 30,8 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-331	36828,00
Машино-место, общ. пл. 13,4 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-334	23544,00
Машино-место, общ. пл. 27,9 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Авакяна,19-337	32076,00
Машино-место, общ. пл. 23,0 кв. м, по адресу: г. Минск, ул. Авакяна, 19-346	26460,00

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. 8 (033) 3637127.
Продавец: СП «ПРОМЕКС» ООО, тел. 8 (033) 3637127.
Организатор торгов: ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 226, комн. 501; +375 (29) 6083100; contact@bankrot-torg.by.
